**Швед В. В., Госцеў А. П., Дабрыян А. А.**

Серыя "Мой горад"
Кніга першая

# ГОРАДЗЕН

Аповяды з гісторыі горада

(10 ст. сярэдзіна 16 ст.)

www.kamunikat.org

Гродна
1996

ББК 63.3 (4 Бел.) Ш-34
УДК 947.6

Кіраўнік калектыву і навуковы рэдактар: В. В. Швед, кандыдат гістарычных павук, дактарант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Белдзяржуніверсітэта.
Рэцэнзент: Г. М. Семянчук

В. В. Швед, А. П. Госцеў, А. А. Дабрыян.

Горадзен. Аповеды з гісторыі горада (10 ст. — сярэдзіна 16 сг.) — Гродна, 1996. 60 с.

Аўтары — мясцовыя гісторыкі і краязнаўцы — задумалі выданне серыі кніг "Мой горад", у якой хочуць расказаць пра лёс горада па Нёмаме — Гродна. У першай кніжцы — аповяды з гісторыі Горадзена або Горадні, як зваўся наш горад прыкладна да 1569 г., да ўваходжання ў склад Рэчы Паспалітай. Вы знойдзеце адказы на пытанні: як нарадзіўся Горадзен? Чаму ў яго такое імя? Які быў герб горада? Як жыў і змагаўся Горадзен у складзе Кіеўскай дзяржавы і Вялікага княства Літоўскага? Што такое "гродзенская архітэктурная школа"?

Разлічана на дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту, а гаксама на ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Гродна. Можа быць выкарыстана як дапаможнік на краязмаўчых курсах у школах і ліцэях.

ББК 63.3 (4 Бел.)
Ш-34

© В. В. Швед, А. І. Госцеў © А. А. Дабрыян

Горад мой — бяссонніца мая,
Як жа не спяваць табе, скажы!..

***(Д. Бічэль-Загнетава)***

# НАМАЛЮЕМ ГОРАД НАШ
(Слова да чытача)

Горадзен, Горадня, Гродна... Наш стары і вечна малады горад. Яму больш як 880 гадоў. Ён сведка многіх падзей, якія адбыліся на яго тэрыторыі і ў наваколлі. А колькі таленавітых сыноў і дачок тут нарадзілася і аддавала сябе і сваю працу на ўмацаванне, упрыгожванне, працвітанне і праслаўленне свайго роднага горада. Ён памятае гарадзенскіх і вялікіх князёў літоўскіх, польскіх каралёў і рускіх цароў. Колькі ваенных навал прайшло праз яго: крыжакі, шведы, французы, немцы - ён выстаяў, бо нездарма на яго гербе ёсць выява аленя святога Губерта - сімвала вольнасці, свабодалюбства.

Аркадзь Смоліч вельмі хораша сказаў пра наш горад: "Гэта адно з цікавейшых і харашэйшых беларускіх месцаў, астравок старой эўрапейскай цывілізацыі сярод наднёманскіх пушчаў". Кожная плошча, кожная вуліца і раён Гродна маюць сваю гісторыю, якая часам цягнецца са старажытнасці. Таму мы, аўтары гэтай кніжкі, — мясцовыя гісторыкі і краязнаўцы, — лічым, што кожны жыхар горада павінен далучыцца да пазнання гродзенскай даўніны.

У меня есть краски,
Есть и карандаш
Я, ребята, город
Нарисую наш.

Так напісаў у сваім вершы "Каложа" Віктар Кудлачоў. Мы вырашылі пайсці шляхам паэта і задумалі напісаць серыю кніг пад назваю "Мой горад". Вы трымаеце ў сваіх руках першую ластаўку - кнігу "Горадзен", дзе знаходзяцца апавяды з гісторыі горада часоў Кіеўскай Русі і Вялікага княства Літоўскага. Другая кніга серыі будзе прысвечана Гродну перыяда Рэчы Паспалітай, трэцяя - гісторыі горада часоў Расійскай імперыі, чацвёртая гісторыі Гродна пасля 1918 года.

А для таго, каб вы зразумелі чаму мы гэта робім, нагадаем вядомыя словы Францішка Скарыны: "Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знают ямы своя; птицы, летающие по воздуху, ведають гнезда своя; рыбы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, — тако ж и люди, игде зродилися и ускромлеины суть по бозе, к тому месту великую ласку имають".

## НАРАДЖЭННЕ ГОРАДА

Многія старажытныя гарады маюць паданні аб сваім узнікнейні. Успомніце легенду аб заснаванні Рыма братамі Рамулам і Рэмам, Турава — князем Турам, ці паданне аб заснаванні Кіева князем Кіям разам з братамі Шчэкам, Харыем і сястрою Лебядзь. На жаль, не захавалася ніякіх паданняў аб узнікненні Гродна. Толькі скупыя летапісныя звесткі праліваюць святло на яго гісторыю.

Лаўрэнцьеўскі летапіс над 1127 г. згадвае князя "Всеволодка із Городна", які разам з іншымі рускімі князямі браў удзел у паходзе на Полацкую зямлю. Гэтая першая летапісная звестка, у якой непасрэдна ўпамінаецца наш горад, і прывяла да таго, што 1127 г. стаў лічыцца годам нараджэння Гродна.

Доўгі час асновай спрэчак паміж гісторыкамі было і месцазнаходжанне летапіснага "Городна". Адныя, як, напрыклад, знакаміты гісторык Гарадзеншчыны, настаўнік гродзенскай гімназіі Яўстафій Арлоўскі, лічылі што, летапіснае "Городно" знаходзілася на Немане. У якасці доказу ён прыводзіў факт існавання Барысаглебскай царквы, якая, на яго думку, была пабудавана ў XII ст. і сведчыць аб старажытнасці горада.

Другія, а іх было больш, у тым ліку гродзенскія гісторыкі Д. Мілюцін і Ю. Ядкоўскі, звязвалі лстапісныя звесткі з невялікім паселішчам з аднайменнай назвай "Городно" недалёка ад Пінска, бо яно знаходзілася бліжэй да іншых усходнеславянскіх гарадоў, у тым ліку і да Кіева.

У выпадках, калі не хапае пісьмовых крыніц, на дапамогу гісторыкам прыходзіць археалогія1 — навука, якая вывучае гісторыю на падставе матэрыяльных крыніц з дапамогаю спецыяльных, уласцівых ёй метадаў. Першыя спробы ўдакладніць летапісныя звесткі з дапамогаю археалогіі былі зроблены Я. Арлоўскім, але яго раскопкі на Старым замку былі забаронены ў самым пачатку.

У 1932 г. пачаліся працы па ўмацаванню схілаў гары Старога замка2, падмытых Нёманам падчас вясновых павадкаў. Зямлю для падсыпкі схіла, каб не вазіць здалёка, бралі непасрэдна ў двары замка.Назіральнікам за ходам усіх прац быў прызначаны дырэктар Гродзенскага музея Юзэф Ядкоўскі. Падчас гэтых земляных прац на пляцоўцы Старога замка былі знойдзены рэшткі старажытных драўляных і

---

1 Археалогія (з грэчаскага: архайос — старажытны, логас — навука) — навука аб старажытнасцях.
2Стары замак - другая назва - Верхні замак.

мураваных пабудоў. Гэтыя знаходкі пераканаўча сведчылі, што летапіснае "Городно" знаходзідася менавіта на беразе Нёмана. Раскопкі працягваліся да 1939 г., але і яны не ўнеслі яснасці ў пытанне аб часе заснавання горада.

У 1949 г. археалагічныя даследаванні Гродна прадоўжыла экспедыцыя пад кіраўніцтвам М. М. Вароніна. Апошнія два дзесяцігоддзі раскопкі праводзілі М. А. Ткачоў, А. А. Трусаў, І. М. Чарняўскі, А. К. Краўцэвіч. Вобразна кажучы, рыдлёўкаю перагортваліся старонкі старажытнай гісторыі нашага горада.

Возьмем з іх прыклад, уявім, што ў нас у руках звычайная рыдлёўка і паглыбімся разам з археолагамі ў гісторыю. А каб даведацца, як узнік і што сабою ўяўляў наш горад у першыя дзесяцігоддзі свайго існавання, нам неабходна будзе паглыбіцца ў зямлю аж на 9 метраў. Менавіта на гэтай глыбіні ляжаць рэшткі першапачатковага паселішча. Перш чым перайсці да аналізу нашых знаходак, зробім невялікі экскурс у гісторыю.

Берагі Кронана, як звалі гады Неман у Заходняй Еўропе, людзі аблюбавалі для жыцця яшчэ ў старажытныя часы. Аб гэтым сведчаць выпадковыя знаходкі неалітычных каменных сякер, кавалкаў начынняў са штрыхоўкай пачатку нашай эры, грубаляпны посуд 6-8 стагоддзяў. На гэтых землях Верхняга Панямання жылі балцкія плямёны - паўночна-заходнія суседзі ўсходніх славян. З другой паловы I тысячагоддзя славяне пачалі паступова засяляць гэтыя землі. Не заўсёды гэты працэс праходзіў мірна. У землі яцвягаў кіеўскія князі рабілі ваенныя паходы. Падчас іх для абароны памежжа будаваліся крэпасці. Так узніклі добра вядомыя нам не па летапісах гарады Слонім, Турэйск, Ваўкавыск.

Самай паўночна-заходняй крэпасцю на лініі абароны ўсходнеславянскіх земляў стала крэпасць пры сутоцы Немана і Гараднічанкі, пабудаваная, верагодна, у час аднаго з паходаў кіеўскім князем ці яго прыхільнікам. Сама прырода ўмацавала і зрабіла зручным для жыцця гэтае месца. Высокі і стромкі бераг Нёмана быў прарэзаны з усходу глыбокім прыродным ярам, а з захаду руслам Гараднічанкі. Жыхарам крэпасці заставалася толькі выкапаць абарончы роў з напольнага паўночнага боку. У выніку атрымалася амаль трохвугольная пляцоўка памерам 120х90х70 метраў.

Каб уявіць, калі ўзнікла, як выглядала першапачатковае паселішча і што на ім рабілася, зноў вярнемся ў раскоп. На глыбіні 9 метраў мы ўбачым слой зямлі, перамешаны з вуглем, дзе-нідзе абвугленыя бярвенні, рэшткі драўляных пабудоў. Сярод зямлі і вугля трапляюцца кавалкі керамікі, зробленай на ганчарным крузе, косці жывёл. Зрэдку

сустракаюцца металёвыя вырабы: жалезныя цвікі, наканечнікі стрэл, нажы, шпоры, замкі, ключы і іншыя гаспадарчыя рэчы.

Сярод знаходак ёсць кавалкі слюды, шкляныя бранзалеты і пацеркі. Звернем яшчэ ўвагу на каменную выбрукоўку ў самым цэнтры паселішча, верагодна, што тут была невялікая плошча. На жаль, шчыльная сучасная забудова не дае нам магчымасці раскапаць усю пляцоўку паселішча. Паспрабуем з дапамогаю гэтых знаходак на падставе гісгарычных аналогій вызначыць гісторыю ўтварэння паселішча. Знойдзеныя рэчы мелі шырокае распаўсюджанне ў іншых славянскіх гарадах і датуюцца X-XI стагоддзямі.

Па аналогіі з гэтым можна меркаваць, што паселішча на беразе Нёмана ўзнікла ў другой палове — канцы XI стагоддзя3. Першапачаткова яно ўяўляла сабою прыродную пляцоўку, штучна ўмацаваную з паўночнага боку ровам і невысокім валам. Магчыма вал апаясваў усю пляцоўку. Па вяршыні вала па перыметру паселішча быў збудаваны вастракол4. Такія паселішчы, якія маюць штучныя ўмацаванні, называюць гарадзішчамі. Трапіць на гарадзішча можна было з усходняга боку праз браму, да якой праз глыбокі яр быў перакінуты драўляны мост. Можна меркаваць, што браму дадаткова абаранялі вежы. Тэрыторыя гарадзішча была хаатычна забудавана невялікімі драўлянымі хатамі, побач знаходзіліся гаспадарчыя пабудовы: стайні, амбары, хлявы. Адзіная вуліца, якая ішла ад брамы да цэнтра паселішча, заканчвалася невялікай плошчай, выбрукаванай камянямі. Рэшткі гэтай брукоўкі мы бачылі ў раскопе.

Археалагічныя знаходкі: зброя, упрыгожванні, кавалкі слюды, якая выкарыстоўвалася ў якасці аконнага шкла, і іншыя рэчы, сведчаць, што асноўную частку насельніцтва гарадзішча складалі заможныя людзі — княжацкія дружыннікі. Акрамя дружыны, тут жылі людзі, якія яе абслугоўвалі, у асноўным рамеснікі. У выніку іх жыццядзейнасці адклаўся на першапачатковай паверхні гарадзішча невялікі слой цёмнай зямлі, на якім мы бачым вугаль і абгарэлыя бярвена. Гэта сведчыць, што паселішча праіснавала нядоўга і загінула падчас пажару. Пра прычыну яго можна толькі здагадвацца, хутчэй за ўсё ўзнік ён у час адной з варожых навал. Аплаўленыя кавалкі шкла, слюды і металу сведчаць, што пажар быў моцны і ахапіў усё паселішча, выпаліўшы яго ўшчэнт.

---

3Некаторыя даследчыкі лічаць, што паселішча ўзнікла ў канцы X-пачатку XI ст.
4 Вастракол — абарончая сцяна ў выглядзе завостраных бярвен пастаўленых шчыльна адно каля другога.

Праз некаторы час уцалелыя жыхары, атрымаўшы падтрымку ад князя, здолелі аднавіць паселішча. Рэшткі папялішча былі засыпаны, а паверхня пляцоўкі ўраўнавана. Сляды гэтых зямельных прац добра відаць у сценках раскопа. Так утварыўся першы пласт зямлі, які адпавядае першапачатковаму паселішчу другой паловы XI стагоддзя. Над ім ляжыць наступны пласт, багаты знаходкамі XII-XIII стагоддзяў. Таўшчыня яго дасягае трох метраў, што сведчыць аб інтэнсіўным будаўніцтве, якое ішло ў гэты час на пляцоўцы Старога замка.

Пасля пажараў у першую чаргу былі адноўлены абарончыя ўмацаванні. Замест ранейшага востракола пабудавалі горадні — прамавугольныя драўляныя зрубы, пастаўленыя шчыльна адзін каля другога. Па версе горадняў ішла баявая галерэя з байніцамі. Верагодна, што па вуглах сцен і ў самых небяспечных месцах абароны існавалі вежы. Паступова адбудавалі дамы і гаспадарчыя пабудовы.

На доўгія гады вызначылася планіроўка паселішча. Асноўная вуліца шырынёю 2 метры, вымашчаная цёсанымі дошкамі, ішла ад ўязной брамы да плошчы, на якой, верагодна, знаходзілася драўляная царква. Уздоўж вуліцы і адыходзячых ад яе завулкаў стаялі невялікія агароджаныя двары. Кожны двор меў драўляную хату з глінабітнаю печкаю і некалькі гаспадарчых пабудоў. З цягам часу павялічылася колькасць жыхароў. Абмежаваная абарончымі збудаваннямі плошча гарадзішча не давала магчымасці паселішчу расці. Будаўніцтва перакінулася на супрацьлеглае ўзвышша, якое цяпер называецца Новым замкам[5]. Тут будаваліся і сяліліся рамеснікі і гандляры. Неўзабаве і тут з'явіліся абарончыя ўмацаванні (роў і вал) і Новы замак пераўтварыўся ў вакольны горад.

Стары замак стаў дзядзінцам — адміністратыўным цэнтрам горада, дзе жыў князь і дружына. За яго моцнымі сценамі можна было схавацца падчас варожай навалы. Побач з дзядзінцам сяліліся новыя гандляры і рамеснікі з ваколіц. Яны будавалі дамы і майстэрні пераважна з паўночнага і паўночна-ўсходняга боку дзядзінца[6].

Гэтую частку паселішча называюць пасадам. Пазней пасад стаў расці ўздоўж левага берага Нёмана, дзе сёння знаходзяцца Падольная вуліца, і на Каложы.

Са з'яўленнем дзядзінца, вакольнага горада і гандлёва-рамесніцкага пасада Горадзен стаў сапраўдным горадам з моцнымі

---

5Новы замак — іншая назва — Ніжні замак.

[6] Сёння гэта тэрыторыя, якая знаходзіцца паміж Старым замкам, р. Гараднічанкай і Савецкай плошчай.

абарончымі ўмацаваннямі, моцнай дружынаю і заможным гандлёва-рамесніцкім насельніцтвам. У гэтыя часы былі закладзены асновы будучага росквіта Горадзена і пераўтварэнне яго ў цэнтр удзельнага феадальнага княства.

## ІМЯ ГОРАДА

Здаўна так павялося: справе папярэднічае слова. Згадайце біблейнае: "спачатку было Слова...". І калі справе мы служым, то да слова прыслухоўваемся. Бо ўпэўнены, што за словамі хаваецца існасць. І нават болей: словы вызначаюць існасць з'яў, дапамагаючы нам спазнаць іх. Нездарма лічыцца, што надаць імя чаму-небудзь значыць спазнаць яго, вызначыць яго існасць. Гэта тычыцца і нашых уласных імёнаў, і назваў самых розных разнастайных рэчаў, з’яў і назваў населеных пунктаў, у тым ліку і гарадоў.

Як надаюцца імёны гарадам? Гэтым пытаннем займаецца спецыяльная навука тапаніміка (раздзел анамастыкі)7. Абапіраючыся на шэраг іншых навук (у кожным асобным выпадку гэта вызначаецца само па сабе), тапаніміка даводзіць нам першапачатковы сэнс тапоніма (той ці іншай уласнай геаграфічнай назвы), у тым ліку і першапачатковы сэнс сучаснай назвы населеных пунктаў.

Мы жывем у старажытным горадзе, імя якога Гродна (нярэдка вы чуеце Горадня, ці Гародня і таксама разумееце, што размова ідзе менавіта аб нашым горадзе). З летапісаў XII стагоддзя нам вядома яшчэ адно, першапачатковае імя Городенъ. І каб даведацца, што азначае сённяшняя назва, трэба спазнаць сэнс першапачатковай назвы, разгледзець, як яна ўжывалася і змянялася на працягу стагоддзяў. А гэта патрабуе ад нас ведання гісторыі свайго горада, спазнання таямніцы яго нараджэння.

На жаль, нараджэнне Гродна самая сапраўдная таямніца. Не захавалася ні больш-менш падрабязных летапісных звестак, ні легенд ці паданняў. Толькі археалагічныя знаходкі дазваляюць навукоўцам рабіць высновы аб тым, што ўяўляў горад Горадзен у XII стагоддзі. Але і археалагічныя доследы не высвятляюць пытанне аб назве горада. Археалогія разам з генеалогіяй дапамогуць нам даведацца аб гістарычных абставінах узнікнення на Замкавай гары, у месцы ўпадзення ў Нёман рачулкі Гараднічанкі княжацкай рэзідэнцыі, якая

---

7Па грэчаску топас (topas) — месца, оніма (onima) -- імя. Дакладней, паходжаннем назваў гарадоў займаецца урбаміміка — раздзел тапанімікі (з лац. urbanis - гарадскі).

ўжо ў 1127 годзе нагадваецца як Горадзен. Але аб гэтым вы чыталі ў папярэднім анавяданні, а зараз давайце паразважаем над этымалогіяй[8] слова Городенъ[9]. Паспрабуем спачатку зрабіць лінгвістычны[10] аналіз.

Корань гэтага слова "ГОРОД", і "ЕНЪ" суфікс. Слова 'Городъ' (горад) слоўнікі тлумачаць, як:

1)Буйны насельны пункт, горад у сучасным разуменні;

2)Крэпасць, умацаванае месца;

3)Крэпасная сцяна, лінія ўмацаванняў.

Як даводзяць археалагічныя знаходкі на пачатку XII стагоддзя, Горадзен быў адносна невялікай крэпасцю, рэзідэнцыяй удзельнага князя, вакол якой сяліліся рамеснікі (так званы рамесніцкі пасад). Таму найбольш верагодна, што першапачатковы сэнс менавіта такі: умацаванае месца, абарончая пабудова, крэпасць. Успомнім, з якой мэтай будаваўся горад: з аднаго боку — стварыць перашкоду для ворага пры ягоных спробах захапіць краіну (абарона дзяржавы), а з другога боку — абарона ўласных жыхароў. Такім чынам, як і ў вузкім, так і ў шырокім сэнсе слова "горад" (ад дзеяслова "гарадзіць") азначае — "абарона".

А суфікс "енъ", як даводзіць вядомы беларускі мовазнаўца, прафесар Гродзенскага універсітэта П. У. Сцяцко, надае назоўніку горад (=абарона) прасторавы сэнс (абарона пэўнай прасторы — сваей дзяржавы). Пры гэтым новае слова — Городенъ — застаецца назоўнікам, сэнс якога — абаронца сваёй краіны. Заўважым пры гэтым, што суфікс "-ня" (-на) лакалізуе значэнне назоўніка і тым самым звужае сэнс назвы населенага пункта).

Значыцца, звычайнае, шырока распаўсюджанае тлумачэнне назвы нашага горада, як "агароджанае месца" не толькі звужае сэнс, але не адпавядае лінгвістычнай сутнасці слова "Городенъ". На жаль, амаль што няма літаратурных фактаў, якія б пацверджвалі менавіта гэтую думку. Амаль што няма... І ўсё ж адзін факт ёсць. І вельмі вядомы. Яго захавала для нас славутае "Слова аб палку Ігаравым"[11].

---

*Ад грэчаскага etymologia (etymon=icuina, сапраўднае значэнне слова) — раздзел мовазнаўства, які вывучае паходжанне слоў.

9у беларускім вымаўленні Горадзен.

10Ад французскага linguistiqne, ад лацінскага lingua=мова -- мовазнаўства.

11Дарэчы, тое, што "Слова аб палку Ігаравым" было напісана менавіта ў сярэднявеччы, а не значна пазней, як даводзяць некаторыя даследчыкі, паказвае ўжо сама назва твора, у якім слова "полк" згодна з асаблівасцямі мыслення еярэднявечнага чалавека адначасова азначае і полк, як вайсковую адзінку, якая выступіла ў паход, і сам паход, і бітву, у якой прыняла ўдзел гэтая вайсковая адзінка ў выніку свайго паходу.

Амаль у самой сярэдзіне гэтага высокамастацкага літаратурнага твора, як жамчужына ў залатой аправе, знаходзіцца песня-плач пра князя Ізяслава Васількавіча. Для паўнаты разумення нагадаем спачатку коратка змест усяго твора.

Вясна 1185 года. Ноўгарад-Северскі князь Ігар Святаслававіч супраць грознаму прадвесцю (сонечнаму зацьменню 1 мая 1185 года) патаемна ад кіеўскага князя Святаслава адправіўся ў паход на полаўцаў. Паход скончыўся паражэннем Ігарава войска і палоненнем Ігара. Русь12 апынулася пад пагрозай палавецкага нашэсця. Красамоўна і абгрунтавана апісвае гэтыя падзеі безыменны аўтар "Слова". Болем і трывогай за родную зямлю напоўнена ягонае чулае сэрца. Гнеўна і мужна далучае ён свой голас у падтрымку "залатога слова" Святаслава і звяртае да ўсіх рускіх князёў палымяны заклік "Загородите полю ворота своими острыми стрелами за землю рускую... Уже бо Сула не течетъ сребреными струями къ граду Переяславлю и Двина болотомъ течеть онымъ грознымъ полочаномъ под кликомъ поганыхь. Единъ же Изяславь, сынь Васильковъ позвони своими острыми мечы о шеломы литовския; притрепа славу дъду своему Всеславу, а самъ подъ чрълеными щиты на кровавь травъ притерпанъ литовскими мечи и с хотию на кров, а тъи рекъ:13 "Дружину твою, княже, птицъ крилы приодъ, а звъри кровь полизаша". Не бысь ту брата Брячяслава, пи другаго — Всеволода. Единъ же изрони жемчужну душу изъ храбра тъла чресъ злато ожерелие... Уныльі голоси, пониче веселие, трубы трубятъ городенскій".

Звярніце ўвагу па перазовы першай і апошняй фраз нагаданага ўрыўка: "Загородите полю ворота... -трубы трубятъ городенскіи". Па думцы акадэміка Д. С. Ліхачова "Слова" наскрозь прасякнута так званымі "скрэпамі" — паэтычнымі перазовамі-метафарамі, сцягваючымі асобныя часткі гэтага мастацкага твора ў суцэльныя "блокі", якія арганічна ўзаемадзейнічаюць адно з адным і па сэнсу, і структурна, ствараючы ўвогуле суцэльны, высокамастацкі паэтычны твор. У нашым выпадку нагаданы перазоў якраз і стварае такую "скрэпу".

А калі мы нагадаем яшчэ шматзначнасць сімволікі сярэднявечча (у дадзеным выпадку тое, што "вароты" сімвалізуюць і горад, і краіну), то ўжыванне аўтарам "Слова" выразу "Трубы трубятъ городенскіи" ўспрымецца як замацаванне яго закліку "загородите полю ворота

---

12На тыя часы — Кіеўскае княства; у дадзеным выпадку - паўдзённыя яго межы.
13Адно з так званых "цьмяных мясцін "Слова..."

своими острыми стрелами" (абараніце краіну ад знешняга ворага — качэўнікаў).

А ўвесь нагаданы ўрывак ўспрымаецца тады як дзівосны рэзанатар, які шматразова ўзмацняе заклік. Ну зусім як збаны-галаснікі Барысаглебскай царквы.

Прааналізаваўшы этымалогію назвы "Городенъ", можна зрабіць выснову, што ў сэнсе, у якім яна выкарыстоўваецца аўтарам "Слова", "Городенъ" азначае толькі адно: "абаронца". Таму ўжыванне загароджы ў якасці геральдычнай фігуры гарадзенскага герба само па сабе павінна было ўспрымацца як "горад-абаронца сваей айчыны" (глыбінны сэнс дзеяслова "загарадзіць" — "абараніць").

Да таго ж, я і сам магу выступіць як сведка і захавацель архаічнага лексічнага факта. З далёкіх гадоў дзяцінства (а прайшло яно, як і ўсё маё жыццё менавіта ў Гродна, мая памяць утрымлівае ваярскі заклік: "Городись!". Так мы, хлапчукі 8-10 гадоў крычалі адзін аднаму, калі гулялі ў мушкецёраў і лёталі на двары з драўлянымі шаблямі. І сэнс гэтага закліку быў, безумоўна, адназначны. Ён пазней, у падлеткавыя гады (гульня ў мушкецёры і тады не страціла для нас папулярнасці) пераўтварыўся ў больш сучасны і больш ветлівы: "Сэр, защищайтесь!". Можа і сапраўды, дзіцёнак найбольш набліжаны да "моманту ісціны" і ягоная псіхіка здольна аднаўляць даўно ўжо забыты дарослымі сэнс слоў.

Назву "Городенъ", ці "Городен" наш горад захоўваў ажно да сярэдзіны XVI стагоддзя. Аб гэтым сведчаць летапісы XII-XVI стагоддзяў, афіцыйныя вялікакняскія і каралеўскія дакументы тых жа часоў, мемуары XVI ст. Напярэдадні аб'яднання Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага ў адзіную федэратыўную дзяржаву і пасля Люблінскай вуніі (1569 г.) назва "Горадзен" пачала паступова замяняцца на "спольшчаную" Гродна (Grodno), якая з цягам часу атрымала перавагу ў афіцыйным ужытку. У народзе спачатку ўсталявалася "прамежкавае" вымаўленне: Горадня (што, мабыць, найбольш адпавядае мілагучнасці беларускай мовы), якое да сярэдзіны XX стагоддзя перайшло ў "Гародню". Сёння можна пачуць абодва варыянты народнага вымаўлення. Нам жа больш дакладным, найбольш адпавядаючым гістарычным вытокам здаецца назва "Горадня". Тым больш, што і сёння першапачатковы сэнс "Городен-Горадня" як горад-абаронца не страчаны. Ён толькі трансфармаваўся ў "абаронца нацыянальнай культуры, народных традыцый". І ў гэтым залог непарыўнасці часу. А значыць і нашай будучыні.

## **ГАРАДЗЕНСКАЕ КНЯСТВА (**ПАЧАТАК ГИСТОРЫІ)

Упэўнена сцвярджаю, што на пытанне аб тым, якія княствы складалі старажытную Беларусь, любы з вас пералічыць Полацкае, Тураўскае, Смаленскае, назаве нават Северскае і ў меншым выпадку напрыканцы нагадае Гарадзенскае. І ўжо зусім нічога не зможа распавесці пра гісторыю Гарадзенскага княства і ягоных князёў.

Ні паданняў, ні разгорнутых летапісных аповядаў не данесла да нас гісторыя пра стварэнне і пачатковыя падзеі Гарадзенскага княства. Адзін Іпацьеўскі летапіс нешматлікімі "зярняткамі" запісамі захаваў да нашага часу сціслыя ўпамінанні аб дзейнасці першых князёў гарадзенскіх. Каб зрушыць гэтую справу, натхнімся радкамі Максіма Багдановіча:

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Пад хвалямі сінеючага Ніла,
Уж колькі тысяч год стаіць магіла:
У гаршку насення жменю там нашлі,
Хоць зерняткі засохшымі былі,
Усе ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.
Вось сімвал твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я верую, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глыбы на прастор прабіцца.

Пасадзім жа і мы свае "зярняткі" ў глебу краязнаўчага доследу і паспрабуем дачакацца руні.

"6624 (1116) ...в се же лето преставися Мстіславь внукъ Игоревъ. Томъ же лете Володимеръ отда дщерь свою Огафью за Всеволодка".

Як бачым, першае летапіснае "зерне" вельмі лаканічнае. Але лаканізм ягоны надта красамоўны, бо захоўвае генетычную інфармацыю. Няхай яна "прарастае" з дапамогай гісторыі, археалогіі, крыніцазнаўства і генеалогіі.

З пачатку трэба зазначыць, што гэта за год такі — 1116-ы для вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха (а менавіта яго называе летапісец пад імем Уладзімір). Да гэтага часу Кіеў пашырыў сваю тэрыторыю на паўночны захад, далучыўшы да свайго княства частку зямлі яцвягаў - Яцвягіі і наблізіўшыся да ўладанняў племені Літва. І

менавіта тады перад Уладзімірам Манамахам паўстала праблема замацавацца на гэтым паўночным рубяжы, забяспечыць ягоную абарону ад балцкіх паганскіх плямёнаў літвы і яцвягаў.

З літаратурных крыніц можна даведацца, што да гэтага моманту малодшая дачка Уладзіміра Манамаха дасягнула шлюбнага ўзросту (на тыя часы 16 гадоў). І тут якраз (ну зусім як сякера пад лаўкай) знайшоўся для яе вельмі ўдалы жаніх. І вось менавіта аб гэтым шлюбе і пойдзе наш падрабязны аповяд.

Каб неяк зрушыцца з месца, запытаемся ў саміх сябе: "А ці выпадкова згаданыя звесткі аб смерці ўнука Ігара Мсціслава і шлюбе Агаф'і са Усеваладкам змешчаны побач? Ці няма паміж імі сувязі?" І тады, зноў звярнуўшыся да пісьмовых крыніц, паступова прыйдзем да высновы, што сувязь ёсць, і сувязь самая непасрэдная: другі гістарычны факт (шлюб) непасрэдна вынікае з першага (смерці). Якім чынам? Каб высветліць гэта, адкажам спачатку на пытанне: Чаму?

Чаму летапісец канкрэтызуе імя князя незвычайным для нас чынам не праз імя бацькі, а праз імя дзеда? Правільна, хутчэй за ўсё таму, што на той час, калі ствараўся летапіс, у Кіеўскім княстве былі вядомы па меншай меры два князі з імёнамі Мсціслаў і імёнамі па бацьку Усеваладавіч[14] (менавіта гэта імя па бацьку даволі лёгка выяўляецца пры аналізе пісьмовых крыніц). Да таго ж, адразу з першай фразы прыведзенай цытаты летапісу позірк дасведчанага чытача перакідвае масток на другую фразу, на імя "Усеваладка" (які таксама ўнук таго ж Ігара, а менавіта Ігара Яраславіча, малодшага, сёмага сына Яраслава Мудрага). Толькі бацькам Усеваладкі быў Давыд Ігаравіч, а бацькам Мсціслава Усевалад Ігаравіч, родны брат Давыда. Такім чынам, згадваючы імя дзеда, летапісец быў упэўнены, што чытач адназначна зразумее аб смерці якога князя ідзе размова і тады яму стане зразумелым непазбежнасць шлюбу Усеваладкі. Чаму?

Каб адказаць на гэтае чарговае "Чаму?", трэба нам з вамі трапіць у Вышгарад у суботу першага тыдня посту (дзень св. Фёдара) 19 лютага 1054 года і надвячоркам зазірнуць у пакой вялікага кіеўскага князя Яраслава Мудрага. Там, ля ложка паміраючага князя, мы ўбачым яго сыноў і пачуем слабеючы голас Яраслава Мудрага: "Вось я адыходжу з гэтага свету. А вы, мае сыны, майце між сабою любоў, бо вы браты ад аднаго бацькі і адной маці. І калі будзеце вы ў любові паміж сабою, то і бог будзе разам з вамі, і падпарадкуе ён вам ворагаў

14 Мсціслаў Усеваладавіч (к. 1080-1116), унук Ігара Яраслававіча (к. 1036-1060) і Мсціслаў Усеваладавіч Гарадзенскі (к. 1125 - пасля 1184), праўнук таго ж Ігара Яраслававіча.

вашых, і будзеце вы жыць мірна. Калі ж вы будзеце ў ненавісці жыць, у сварках, то і самі загінеце, і зямлю бацькоў сваіх і дзядоў сваіх пагубіце, якую яны здабылі працай вялікай. Так слухайце брат брата, жывіце мірна. Зараз жа даручаю я — замест сябе — стол свой, Кіеў, старэйшаму сыну свайму, брату вашаму, Ізяславу. Слухайце яго, як слухалі і мяне, няхай ён вам будзе замест мяне. А Святаславу даю я Чарнігаў, Усеваладу — Пераяслаўль, Вячаславу – Смаленск, Ігару - Уладзімір". Такім чынам нам з вамі давялося прысутнічаць пры апошніх хвілінах жыцця Яраслава Мудрага, які памёр у ноч на 20 лютага 1054 года і нават пачуць з ягоных вуснаў завяшчанне.

По гэтаму завяшчанню на Русі было ўведзена правіла прыступкавага (лесвічнага) узыходжання на Кіеўскі вялікакняскі стол: вялікім князем мог стаць толькі старэйшы з жывых сыноў Яраслава Мудрага, астатнія аўтаматычна ўздымаліся на прыступку вышэй: з Уладзіміра — у Смаленск, з Смаленска — у Пераяслаўль, з Пераяслаўля — у Чарнігаў, з Чарнігава — у Кіеў. Адсюль, зноў такі аўтаматычна, нашчадкі бацькі памерлага раней дзеда страчвалі права наследвання бацькоўскай (айчыннай) зямлі і станавіліся князямі-ізгоямі. Гэтае правіла прыступкавага ўзыходжання дапамагала захаваць адзінаўладдзе ў Кіеўскім княстве ў руках старэйшага з прадстаўнікоў роду і забяспечыць непадзельнасць, адзінства ўсяго княства, яго палітычную моц.

Калі б князі паміралі згодна свайго ўзросту, то ўсё ішло б нармальна. Але Яраслаў Мудры не ўлічыў, не прадугледзеў ні толькі ізгойства, але і выпадковасці чалавечага жыцця. Ні толькі сын можа памерці раней бацькі, але і малодшы брат раней старэйшага. І тады колькасць князёў-ізгояў памнажаецца і, як наказала жыццё, два-тры князі-ізгоі, інтарэсы якіх (забеспячэнне сябе ўдзеламі) супадаюць, ствараюць рэальную небяспеку для адзінства дзяржавы.

Сталася так, што спачатку памёр перадапошні сын Яраслава Мудрага Вячаслаў (1057 г.), які сядзеў у Смаленску. Аўтаматычна на ягонае месца прыйшоў Ігар Яраслававіч (а горад Уладзімір дастаўся князю-ізгою, сыну старэйшага з Яраслвічаў Уладзіміра, памерлага на два гады раней бацькі (1052), Расціславу Уладзіміравічу). Але ў 1060 годзе ва ўзросце 24 год памірае Ігар Яраслававіч і ягоныя сыны Усевалад і Давыд становяцца ізгоямі.

Праз 20 год, калі падрастае і набірае моц Давыд Ігаравіч, старажытныя летапісы надаюць яго дзейнасці вялікую ўвагу: захоп Тмутаракані, асляпленне па ягонай ініцыятыве Васілька Расціславіча.

Каля 1098 г. Давыд Ігаравіч ажаніўся на дачцы Валадара, унучцы згаданага вышэй Расціслава Уладзіміравіча, і ў яго нарадзіўся сын Усевалад (Усеваладка). Сваім нараджэннем ён спалучыў старэйшую

(праз Уладзіміра Яраславіча) і малодшую (праз Ігара Яраславіча) генеалагічныя лініі Яраславічаў і генетычна ўвабраў у сябе лепшыя рысы сваіх продкаў: упартасць, светлы розум, рашучасць, памяркоўнасць.

У 1112 годзе Давыд Ігаравіч памірае і адзіным апекуном стаўшага князем-ізгоем падлетка Усеваладка застаецца ягоны старэйшы стрыечны брат Мсціслаў — гаксама ізгой. І калі памірае ў 1116 годзе гэты апошні апекун, на дапамогу юнаку прыходзіць сваяк - вялікі кіеўскі князь Уладзімір Манамах. Ён ажаніў Усевалада з Агаф'яй і ў якасці пасага маладым даў Замкавую гару над Нёманам і пажаданне замацоўваць паўночныя межы Кіеўскага княства. У 1116 годзе тут і ўзнікла княская рэзідэнцыя, стаўшая цэнтрам удзельнага Гарадзенскага княства; ужо ў 1127 годзе яно згадваецца летапісцамі. У Гарадзенскім княстве налічвалася каля 20 насельных пунктаў: Ваўкавыеск, Услонім, Здзітаў, Турыйск, Мсцібогаў і іншыя.

Княгіня Агаф'я Уладзіміраўна была таксама нашчадкам Яраслава Мудрага (праз Усевалада Яраславіча) і да таго ж унучкай апошняга англа-саксонскага караля Гаральда, дачка якога, Гіта, пасля гібелі бацькі ў 1067 годзе разам з маці трапіла на еўрапейскі кантынент і неўзабаве стала жонкай Уладзіміра Манамаха.

Вось якія парасткі дало толькі адно, амаль ссохлае за даўнасцю часоў "зернятка" старажытнай пісьмовай крыніцы. Наступныя "зерняткі" мы толькі ўкінем у глебу, бо для парасткаў з іх, мабыць, яшчэ не прыспеў час.

Як ужо адзначалася, гарадзенскі князь згадваецца ў летапісах пад 1127 годам. Летапісец паведамляе: "Пасла князь Мстиславъ братью свою на Кривиче четырьми пути. Вячеслава ис Турова, Андрея из Володимира. А Всеволодка из Городна. И Вячеслава Яраславича ис Клечска. Тем повеле ити к Изяславлю..." (з Лаўрэнцьеўскага летапісу). Як бачым, слова "пасла" сведчыць аб тым, што ўсе чатыры князі былі васаламі вялікага князя кіеўскага Мсціслава Уладзіміравіча, а значыцца знаходзіліся ў палітычнай залежнасці ад яго. У тым ліку і гарадзенскі князь Усевалад Давыдавіч (нават імя яго і тут падаецца змяншальна, як у выпадку з 1116 годам: "Усеваладка з Горадна".

Але ўжо праз пяць гадоў летапіс паведамляе: "Ходи Мстиславъ па Литву съ Всеволодомъ Городенским". Такая павага летапісца (поўны тытул князя), безумоўна, сведчыць аб тым, што Гарадзенскае княства, дзякуючы асабістым якасцям ягоных уладароў, дамаглася адноснай палітычнай незалежнасці і стала саюзнікам Кіева. Пацверджаннем гэтага з'яўляецца і сумнае паведамленне летапісаў аб смерці Усевалада Гарадзенскага ў 1141 годзе ("Преставися Всеволодъ Городенский"), а таксама запіс пад 1144 г. аб паходзе на Галіч Барыса і Глеба Усева-

ладавічаў разам (а не па загаду!) з кіеўскім князем Усеваладам. Барыс і Глеб — гэта старэйшыя сыны Усевалада і Агаф'і. Былі ў іх яшчэ адзін сын Мсціслаў і дзве дачкі, якіх у 1144 годзе кіеўскі князь Усевалад аддаў замуж: адну за Уладзіміра Давыдавіча Чарнігаўскага, другую — за Юрыя Яраславіча Тураўскага. Імёны дачок летапіс не згадвае, але калі ўлічыць існуючую ў тыя часы добрую традыцыю даваць дзецям імёны бабуль і дзядуль, то можна дапусціць, што адна з дачок Агаф'і і Усевалада атрымала імя ў гонар сваёй бабулі па маці, дачкі караля Гаральда Гіты, а імя бабулі па бацьку Ланкі ці Алены, Ілоны, атрымала другая дачка.

Тая дачка, якая выйшла замуж за Уладзіміра Давыдавіча (яе верагоднае імя Гіта), мела сына Святаслава, які ў 1159 годзе ажаніўся на дачцэ Андрэя Багалюбскага. Другая сям'я (Ланка Усеваладаўна і Юры Яраславіч) дала пачатак дынастыі пінскіх князёў, радавод якіх выводзіць на князёў Астрожскіх і ў тым ліку, на славутага князя, героя Аршанскай бітвы 1514 года, Канстанціна Астрожскага. Так што гарадзенцы могуць ганарыцца тым, што ў жылах гэтага чалавека цякла кроў гарадзенскіх князёў!

Генеалогія гарадзенскіх князёў, якая бярэ пачатак ад князя Рурыка, не абмяжоўваецца толькі галінай Яраславічаў. Ёсць падставы сцвярджаць, што другая галіна роду Рурыкавічаў, якая спалучылася з Рагвалодавічамі — Ізяславічы (з ёю перш за ўсё звязана гісторыя Полацкага княства), таксама мае дачыненне і да Гарадзенскага княства.

Звернемся зноў да згаданага намі ў аповядзе "Імя горада" песніплача пра Ізяслава Васількавіча Полацкага з "Слова аб палку Ігаравым". Апошнія словы згаданага ўрыўка: "...Трубы трубят городенскія" становяцца больш зразумелымі, калі меркаваць, што ў склад Гарадзенскага княства XII стагоддзя ўваходзіў Наваградак. На карысць гэтага сведчыць і замоўчванне Навагародка летапісамі XII ст.: закладзены яшчэ ў 1044 годзе Яраславам Мудрым, ён тады яшчэ не набыў вялікага палітычнага і культурнага значэння і падпарадкоўваўся Горадзену. А зараз давайце зробім яшчэ больш фантастычнае меркаванне. Што, калі загадкавы Ізяслаў Васількавіч, імя якога сустракаецца толькі ў "Слове аб палку Ігаравым", ніхто іншы як летапісны Усяслаў Васількавіч? Перапісчыкі "Слова..." маглі трансфармірваць імя Усяслаў у "Ізяслаў" выпадкаў скажэння тэксту, так званых "цьмяных мясцін" у "Слове..." нямала. Летапісныя звесткі даносяць, што Усяслаў Васількавіч з 1161 года па 1186 год быў спачатку полацкім, а потым віцебскім князем, а ў 1186 годзе "З Друцка Усяслаў" разам з Давыдам Расціславічам Смаленскім, сынам яго Мсціславам Давыдавічам Ноўгародскім і Васільком Валадаравічам

Лагожскім пайшоў на Полацк. Палачане тады змірыліся з ноўгародцамі і смалянамі, але іх узаемаадносіны з Усяславам Васількавічам маглі абвастрыцца настолькі, што ён вымушаны быў шукаць ратунку ў землях Гарадзенскага княства. Менавіта ў Навагрудку, дзе на той час ужо мог княжыць вядомы па летапісах як Наваградскі князь, ягоны пляменнік Мікула Валодшыч. Верагодна, што Усяслаў Васількавіч працягваў заставацца друцкім князем і ў тым жа 1186 годзе выступіў супраць вояў племені літв, якія звычайна выступалі на баку полацкіх князёў, і загінуў. Гэта быў самы свежы прыклад драматычнага выніку ўсобіц паміж князямі братамі па крыві. І менавіта яго выкарыстаў аўтар "Слова...", каб замацаваць свой заклік да яднання нашчадкаў Яраслава Мудрага і Усяслава Брачыславіча (Усяслава Чарадзея): "Яраслаўлі ўсе ўнукі і Усяслаўлі!". Палітычныя ўзаемаадносіны, якія складваліся паміж Полацкім і Кіеўскім княствамі не дазволілі ажыццявіць палымяны заклік аўтара "Слова...". А нам з вамі зразумела, чаму на дапамогу Усяславу Васількавічу не прыйшлі браты Брачыслаў і Усевалад яны былі на баку Полацка, а значыць і "літоўцаў". Зразумела таксама і чаму "Трубы трубятъ городзенскій" бо князь загінуў за інтарэсы і Гарадзенскага княства і, магчыма, на яго тэрыторыі.

Летапісныя "зярняткі" разам з археалагічнымі здабыткамі даюць толькі першыя "ўсходы". Хочацца спадзявацца, што маладое пакаленне гарадзенскіх краязнаўцаў з плёнам працягне высакародную "землеробчую" (краястваральную) справу

## ГРОДЗЕНСКАЯ ШКОЛА ДОЙЛІДСТВА

З папярэдніх аповядаў мы даведаліся пра ўзнікненне паселішча на беразе Нёмана, аб паходжанні яго назвы. Шляхам крапатлівага аналізу летапісаў вызначылі радавод гарадзенскіх князёў і іх месца ў тагачаснай палітыцы Кіеўскай дзяржавы. Даведаліся, што за кароткі тэрмін Горадзен пераўтварыўся з невялікай памежнай крэпасці ў цэнтр магутнага ўдзельнага княства. Чаму мы называем толькі што нарадзіўшаеся княства магутным? Ці ёсць падставы для гэтага? Паважлівыя адносіны да гарадзенскага князя, калі летапісец называе яго Усеваладам Гарадзенскім замест ранейшага Усеваладкі, можна лічыць толькі ўскоснай падставай. Павінны быць больш грунтоўныя доказы. Давайце разам паспрабуем іх знайсці.

Для гэтага ўспомнім добра вядомы нам 1116 г., калі ў Горадзене ўзнікла княжаская рэзідэнцыя, а горад стаў цэнтрам удзельнага Гарадзенскага княства. Як гэта падзея адбілася на самым горадзе? Зразумела, што паскорылася яго развіццё, асабліва будаўніцтва. У пер-

шую чаргу яно вялося на дзядзінцы, дзе быў, верагодна, пабудаваны драўляны княжаскі палац і неабходныя для ўтрымання княжаскай сям'і і дружыны гаспадарчыя пабудовы. Новы статус горада садзейнічаў развіццю рамёстваў і гандлю, што ў сваю чаргу выклікала значнае будаўніцтва на тэрыторыі пасада, які стаў пашырацца ўздоўж берага Нёмана.

Археалагічныя раскопкі 1932-1939 гадоў і архітэктурныя даследаванні рэштkaў выяўленых тады муроў вызначылі, што гэта разбураныя сцены мураванага княжаскага палаца і царквы. Пабудаваныя з плінфы15, пакладзенай на цамянку16 з устаўкамі з вялікіх шліфаваных камянёў і паліваных плітак, яны сведчылі аб існаванні ў XII ст. у Горадзене будаўнічай традыцыі, атрымаўшай назву "гродзенская архітэктурная школа".

Мураваныя будынкі былі незвычайнай і рэдкай з'явай у тагачаснай забудове гарадоў, асабліва Горадзена, далёкага ад культурных і палітычных цэнтраў Кіеўскай дзяржавы. Таму ёсць падставы больш падрабязна ахарактарызаваць кожны з іх.

Першым мураваным збудаваннем Горадзена з'яўляецца Ніжняя царква17 на дзядзінцу. Пабудавана яна па адной версіі (М. Варонін) пры князі Усеваладзе Давыдавічы ў другой чвэрці XII ст. Як лічаць даследчыкі, у будаўпіцтве прымалі ўдзел арцель плінфатворцаў з Полацку і арцель муляраў з Валыні, якім дапамагалі шматлікія гарадзенскія рамеснікі і будаўнікі. Па другой версіі (Л. М. Бальшакоў, П. А. Рапапорт, А. А. Трусаў, М. А. Ткачоў) Ніжнюю царкву пабудавалі на пачатку 1180-х гадоў пры Мсціславе Усеваладавічы, калі ў Горадзене пачаў працаваць вядомы па летапісу дойлід Петр Міланег18.

Пабудавана царква з плінфы. Каб прыдаць храму своеасаблівы каларыт і прыгажосць, а таксама зберагчы плінфу, звонку ў сцены ўмуроўвалі шліфаваныя камяні рознага колеру, унізе - буйныя, вышэй — меншыя. Акрамя камянёў фасады аздаблялі керамічнай маёлікавай пліткай жоўтага, зялёнага і карычневага колеру. З іх выкладваліся

15Плінфа - тонкамерная, амаль квадратная цэгла, выкарыстоўвалася ў мураваным будаўніцтве X-XII стагоддзяў.

16Цамянка - расчына з вапны з дабаўкаю тоўчанай цэглы.

17Старадаўная назва невядома ці яе не паспелі асвяціць да пажару 1183 г., назву Ніжняя атрымала таму, што пазней пасля разбурэння на яе месцы была пабудавана новая царква, атрымаўшая назву Верхняя.

18Пётр Міланег працаваў у Горадзене каля 12-15 год, традыцыі горадзенскай школы дойлідства распаўсюджваў у будаўніцтве цэркваў у Чарнігаве, Овручы, Белгарадзе. З 1194 г. быў асабістым архітэктарам кіеўскага князя Рурыка Расціславіча.

разнастайныя камбінацыі крыжоў. Гэты прыём упрыгожвання храмаў выкарыстоўваўся толькі ў Горадзене.

Характэрнымі для ўсіх храмаў была таксама іх планіроўка. Ніжняя царква была шасцістоўпнай трохнефавай[19] з трыма абсідамі[20] даўжынёю 18,4 метра і шырынёю 11,7 метра. Звонку выдзялялася толькі адна цэнтральная абсіда, а дзве бакавыя былі схаваны ў мятровай таўшчыні сцен. Вуглы царквы, як і вуглы квадратных у плане слупоў, на якія абапіраліся скляпенні і барабан купала, былі зрэзаны пад вуглом у 45 градусаў. Незвычайным было і ўнутранае ўбранства царквы. Сцены зверху і амаль што да нізу былі ўсеяны невялікімі адтулінамі галаснікоў — гліняных збаноў, умураваных у сцяну. Галаснікі аблягчалі вагу сцен і прыдавалі царкве добрую акустыку — узмацнялі гукі, але не пакідалі месца для роспісаў — абавязковага элемента ўпрыгожвання храмаў таго часу.

Падлога царквы, выкладзеная з каляровых маёлікавых плітак семнаццаці відаў, уяўляла сабою арнамент з розных геаметрычных фігур і кантрасна вылучалася з агульнага фона сцен. Дах Ніжняй царквы быў накрыты свінцовымі лістамі і завяршаўся купалам. Па меркаваўйню М. М. Вароніна, царква мела званніцу, аб чым сведчаць кавалкі звона, адзін з якіх важыў 27 кілаграмаў і меў надпіс, ад якога захавалася толькі частка: "...рабу...".

Пасля ўзвядзення Ніжняй царквы, мураванае будаўніцтва набыло большы размах. За кароткі тэрмін у паўднёвай частцы дзядзінца быў пабудаваны княжаскі палац. Рэшткі палаца сведчаць, што ён быў двухпавярховым. На першым паверсе было два памяшканні. Падлога другога паверха была пакладзена па драўляным бэлькам і выкладзена маёлікавымі пліткамі. Сцены яго, як і Ніжняй царквы, зроблены з плінфы. Звонку ўмураваны амаль неапрацаваныя камяні. Пабудаваныя з аднаго матэрыялу і з аднолькавымі мастацкімі асаблівасцямі, царква і палац добра спалучаліся і выразна вылучаліся на фоне іншых драўляных пабудоў дзядзіпца, увасабляючы сабою ўладу гарадзенскага князя.

Незвычайна для таго часу на фоне драўляных пабудоў выглядалі на дзядзінцы мураваныя сцены, змяніўшыя ранейшыя гарадні ў найбольш небяспечных месцах абароны. Пабудаваныя з паўночнага і ўсходняга бакоў цалкам з плінфы, сцены мелі таўшчыню паўтара

---

19Неф — прадаўгаватае памяшканне, частка інтэр'ера абмежаваная з аднаго ці абодвух бакоў радамі калон або слупоў.

20Абсіда — выступ будынка, звычайна паўкруглы або шматвуголны ў плане і ўнутраная прастора храма, якая складае частку алтара.

метра і вышыпо больш пяці метраў. Завяршаліся яны галерэямі са страхой над баявым ходам. Падобных сцен не мелі нават Кіеў, Ноўгарад і Полацк.

Яшчэ адна царква, вядомая па дакументах XVI ст. пад назвай Прачысценская, была знойдзена ў 1980 г. археалагічнай экспедыцыяй пад кіраўпіцтвам І. М. Чарняўскага. Яна знаходзілася на тэрыторыі гандлёва-рамесніцкага пасада на паўночны ўсход ад дзядзінца[21]. Падобная на Ніжнюю царкву, Прачысценская адрознівалася ад яе толькі тым, што яе сярэдняя абсіда была не паўкруглай, а прамавугольнай.

Па меркаванпо А. К. Краўцэвіча, у канцы XII ст. у Горадзене існавала яшчэ дзве царквы. Адна з іх знаходзілася на тэрыторыі пасада на поўнач ад дзядзінца, на беразе Гараднічанкі, другая размяшчалаея на тэрыторыі вакольнага горада.

Трагічны лёс напаткаў помнікі гродзенскага мураванага дойлідства XII ст. Ніжняя царква неўзабаве пасля ўзвядзення пачала разбурацца з-за нераўнамернай асадкі падмуркаў (па версіі М. Варо-ніна), а ў 1183 г., калі Горадзен, як сведчыць летапіс "погоре всь и церквы каменная от блистания молнии и шибения грома", разбурылася канчаткова і прыйшла ў заняпад. Княжаскі палац, абарончыя сцены і Прачысценская царква яшчэ доўга служылі гарадзенцам, але і яны не вытрымалі шматлікіх пажараў і разбурэнняў, якія выпалі на долю Горадзена. Княжаскі палац быў разбураны ў XVI ст., а Прачысценская царква загінула ў выніку пажара ў сярэдзіне XVII ст.

Адзіным захаваўшымся да нашых дзён у паўразбураным стане, сведкам былой прыгажосці Горадзена і магутнасці гарадзенскага княства з'яўляецца царква Барыса і Глеба22. Яна была закладзена на тэрыторыі пасада ў пачатку 80-х гадоў XII ст. гарадзенскім князем Мсціславам Усеваладавічам у гонар святых заступнікаў сваіх памерлых братоў Барыса і Глеба. Пры ўзвядзенні царквы былі ўлічаны ўсе памылкі, дапушчаныя пры будаўніцтве папярэдніх храмаў. Падмуркі былі закладзены на глыбіню паўтара метра. У муроўцы сцен былі выкарыстаны шліфаваныя камяні меншых памераў. Царква захавала ранейшую шасцістоўпную трохабсідную планіроўку. Нягледзячы на меншыя памеры (даўжыня 21,5 м, шырыня 13,5 м, таўшчыня сцен 1,2

---

[21] Сёння гэта тэрыторыя царквы Ражства Багародзіцы.

223 1405 г. царква атрымала другую назву - Каложская, ад назвы прыгарада Пскова Каложэ, жыхары якой і былі захоплены ў палон Вялікім князем Літоўскім Вітаўтам і паселяны каля царквы.

м), унутраная прастора храма здавалася большай, дзякуючы ўпершыню выкарыстаным тут круглым слупам.

Удасканаліліся і ўскладніліся некаторыя архітэктурныя дэталі. Звычайныя хары дапаўняліся бакавымі, да якіх вялі дзве лесвіцы, схаваныя ў тоўшчы сцен. Уся ніжняя частка сцен, свабодная ад галаснікоў, прарэзана дэкаратыўнымі нішамі. Падлога храма па ранейшаму была ўпрыгожана рознакаляровым дываном з маёлікавых плітак.

Змяніўся і знешні выгляд царквы. У першую чаргу заўважым, што ў адрозненне ад папярэдніх, Ніжняй і Прачысценскай, царква Барыса і Глеба мае тры выступаючыя абсіды. Больш складаным стала ўпрыгожванне фасада і багацейшым аздабленне вонкавых сцен дэкаратыўнымі маёлікавымі пліткамі, якія добра спалучаліся з ўстаўкамі з невялікіх рознакаляровых каменяў. Добра абпаленая чырвоная плінфа, белая цамянка, прыродны колер камянёў, бліщчастыя маёлікавыя пліткі, якія як ізумруды ігралі на сонцы, надавалі царкве святочны выгляд і прыгажосць.

Час не пашкадаваў Барысаглебскую царкву. У часы шматлікіх крыжацкіх навал і войнаў абваліліся купал і скляпенні царквы. У выніку вясновых паводкаў 1853 і 1889 гадоў абваліліся ў Нёман паўднёвая сцяна з абсідамі і частка заходняй сцяны. Пазней абваліўшыеся часткі муроў былі заменены лёгкімі драўлянымі сценамі і накрыты звычайным дахам. У такім выглядзе царква захавалася да нашых дзён, не страціўшы сваёй своеасаблівай прыгажосці. Яе існаванне — яскравае пацверджанне таго, што Горадзен сапраўды быў не толькі цэнтрам моцнага ўдзельнага княства, але і культурным цэнтрам паўночна-заходніх славянскіх зямель. Дарэчы, па колькасці мураваных пабудоў (а іх толькі пяць знойдзеных) Горадзен апярэдзіў такія вядомыя старажытныя гарады, як Мінск, Тураў, Уладзімір-Валынскі, Пскоў, Разань, Суздаль, Растоў.

Сёння царкве ў імя святых Барыса і Глеба пагражае разбурэнне. Стромкі схіл берага паволі асядае і калі яго не ўмацаваць, можа здарыцца так, што апошні помнік XII ст. у Горадзене згіне назаўсёды. Будзем спадзявацца і рабіць усё, каб гэтага не адбылося. Барысаглебская царква — наша спадчына, якая засталася нам ад продкаў. Сюды прыходзілі яны ў хвіліны радасці ці гора, каб пагаварыць з Богам, падзякаваць за пражыты дзень, папрасіць у яго добрага наступнага дня. Тут адпявалі нябожчыкаў і хрысцілі нованароджаных гараджан. Царква як бы сімвалізуе вечнасць і непарыўнасць жыцця.

## "ГУДЗЯЦЬ ГАРАДЗЕНСКІЯ ТРУБЫ"

Стаю ў адным з залаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея і з жахам разглядваю двуручны меч з красамоўным надпісам на старанямецкай мове "Dring Blut" ("Пі кроў"). Ён — нямы сведка крывавых бітваў з крыжакамі. Я думаю вы ўспомніце, што адзін з раёнаў нашага горада мае назву "Падкрыжакі" — можа яна таксама з тых далёкіх часоў?

Дык хто ж такія крыжакі?

У 1190 г. падчас трэцяга крыжовага паходу ў Палестыну быў афіцыйна створапы каталіцкі духоўна-рыцарскі ордэн братоў-рыцараў Тэўтонскага дому Дзевы Марыі ў Ерусаліме. Членамі яго магла быць толькі нямецкая шляхта даўняга роду. А паколькі на Захадзе немцаў звалі тэўтонамі, дык і ордэн стаў звацца Тэўтонскім. Па нашытых на белых плашчах чорных крыжах на левым плячы нашы продкі празвалі братоў-рыцараў крыжакамі.

Крыж на плашчы падкрэсліваў галоўны абавязак рыцара — несці "слова божае" ў паганскія (язычніцкія) землі, паўставаць на абарону святой зямлі і ўсіх хрысціянскіх земляў супраць ворагаў веры, падтрымліваць і бараніць касцёл. Таму калі мазавецкі князь Конрад запрасіў у 1225 г. крыжакоў да абароны межаў свайго княства ад ваяўнічых паганскіх плямёнаў прусаў, дык яны з задавальненнем адгукнуліся. Рымскі папа аб'явіў крыжовы паход супраць прусаў, яго ўдзельнікам адпускаліся грахі, падобна крыжакам, якія хадзілі ваяваць за святую зямлю ў Палестыну.

Конрад Мазавецкі па прывілею 1230 г. аддаў Тэўтонскаму ордэну на вечныя часы Хэлмінскую зямлю і ўсё, што будзе імі здабыта ў Прусіі. Але крыжакі гэтым не здаволіліся і пачалі заваёўваць прусаў, будаваць на іх землях замкі. З гэтага года можна адлічваць складванне ў Прусіі ордэнскай дзяржавы. У 1237 г. з Тэўтонскім ордэнам аб'ядналіся рэшткі ордэна рыцараў Хрыста (мечаносцаў або Лівонскі ордэн). Сваю экспансію створаная дзяржава накіравала на суседзяў: Польшчу, Літву, Беларусь. Крыжацкі храніст Пётр Дзюзбург пад 1238 г. адзначыў: "Скончылася пруская вайна, пачалася вайна літоўская".

У паэме "Конрад Валенрод" Адам Міцкевіч пра пабегі крыжакоў на Літву23 напіша:

К ней идут крестоносцев отряды бесчисленным войском;

23Пад Літвою разумеецца тэрыторыі Верхняга Панямоння, якая аказалася ў цэнтры фарміравання Вялікага княства Літоўскага, у якое ўваходзілі і беларускія землі.

Гул движенья их из-за Немана ветер доносит,
Лязг оружья, военные клики и конское ржанье.

З 1250 г. Лівонскі ордэн пачаў набегі ў глыб Панямоння, а ў 1413 годзе быў апошні драпежніцкі паход. Ёсць лічба, што за 1340-1410 гады крыжакі здзейспілі 97 паходаў на Літву — Беларусь, а ліцвіны24 ў адказ - каля 55 паходаў. Свае напады крыжакі тлумачылі місіянерскімі мэтамі — барацьбы з паганцамі-язычнікамі, схілення іх у лона хрысціянскай царквы. Але ў 1385 г. вялікі князь літоўскі Ягайла прыняў хрысціянства, а напады не скончыліся, бо на самой справе браты-рыцары кіраваліся агрэсіўнай ваенна-палітычнай канцэпцыяй ордэна "Дранг нах Остэн" ("Націск на Усход"), канчатковай мэтай якой было стварэнне Вялікай Тэўтоніі ад вострава Руген у Балтыйскім моры да Фінскага заліва з уключэннем у яе склад Польшчы, Беларусі, Літвы, Пскоўшчыны і ўладанняў Вялікага Ноўгарада.

Штурмавалі крыжакі Наваградак (4 разы), Полацк (5 разоў), Лідскі замак (3 разы) і Ваўкавыск. Але больш за ўсіх перапала Горадзену — каля дваццаці нападаў, паходаў, наездаў, сутычак. Чаму ж менавіта гарадзенцаў так "мілавалі" крыжакі? З моманту паяўлення першых людзей над Нёманам Горадзен стаў абарончым месцам ад невядомай і некіруемай прыроды, крэпасцю для мабілізацыі сілаў. Горад узнік на месцы, дзе Нёман (тады Мемель, Кронан) перарэзваў пракладзены стагоддзямі гандлёвы шлях з Балтыкі на Усход. Горадзен быў ключом да земляў беларуска-літоўскага Панямоння з боку Мазовіі і Тэўтонскага ордэну. Вось чаму наш горад быў прывабным кавалкам, які спакушаў многіх захопнікаў -у тым ліку і крыжакоў.

Хто толькі ні пабываў пад сценамі непрыступнага Горадзена? "Паход на Гартэн"25 пісаў даследчык Міхась Ткачоў, — лічыўся вышэйшай адзнакаю і гонарам маладога еўрапейскага дваранства, рамантычнай тэмаю прыдворных свецкіх баляў і піроў. З Германіі, Францыі, Швецыі, Галандыі, Даніі, Італіі, Іспаніі, Чэхіі і Англіі атрад за атрадам ішлі крыжакі "на Гартэн". Хто іх толькі ні ўзначальваў: магістр26 тэўтонаў Конрад Цірнберг (1284 г.), комтуры27 Кенігсберга і Брандэнбурга, магістры Лівойскага ордэна і англійскія графы Чэмберлены, Нортумбеленгі і Бэдфарды".

---

24Ліцвіны - назва жыхароў Літвы. Не блытаць з этнічнаю Летувой (Жамойціяй).
25Гартэн — так крыжакі называлі Горадзен.
26Магістр — глава ордэна.
27Комтур — камандор або правіцель буйнага замка-горада на тэрыторыі ордэна і яго акруг.

Вось хроніка іх крывавых спраў:

1284 г. Пад сцены Старога гарадзенскага замка раптоўна прывёў свае войскі магістр Конрад Цірнберг. Ён прыйшоў пакараць прусаў, якіх восем гадоў назад пасяліў у Горадзене вялікі літоўскі князь Тройдзен. Гарнізон замка доўга абараняўся, але, дзякуючы здрадзе прусаў Скомунда і яго брата, брама была адчынена і крыжакам удалося ўварвацца ў горад. Гэта адзін з нямногіх выпадкаў поспеху крыжакоў, ды і то няпоўнага, бо, відаць, захапілі яны толькі Ніжні замак. Спалілі дамы, абрабавалі жыхароў, а саміх іх або забілі, або забралі ў няволю.

1296 г. Двойчы спрабавалі крыжакі захапіць Горадзен. Спачатку зімою прывёў іх камандор з Балгі Зігфрыд Райбэрг. Яны напалі на навакольныя вёскі і спалілі дальняе прадмесце, але да замка падысці пабаяліся. Потым вясною, калі князя не было ў замку, спрабаваў знайсці сваё шчасце Генрых Зуцверт. Яму таксама не пашанцавала — адышоў з вялікімі стратамі пад праследваннем моцнага гарадзенскага атрада.

1305 г. Камендант Брандэнбурга комтур Конрад Ліхтэнхаген дашчэнту разбурыў ваколіцы Горадзена, а замак выстаяў, і праз два дні конніца Гедыміна адкінула ворага.

1306 г. Магістр Конрад Сак атрымаў інфармацыю аб кепскай абароне Горадзена і адсутнасці там князя Віценя. Захапіць горад ен пасылае рыцара Альберта Гагеля на чале 400 воінаў. Набег аказаўся беспаспяховым. Такім жа быў наступны паход сотні ордэнскіх братоў і 6000 коннікаў на чале з камандорам Кенігсберга Эбергардам Варнембергам. Крэпасць вытрымала штурм, які працягваўся з усходу сонца да палудня. Рыцары вымушаны былі адысці, страціўшы шмат людзей. У тым ліку аднаго з лепшых рыцараў Хартмана Эльстэрбурга.

1311 г. Горадам спрабаваў авалодаць комтур фон Отта Берган на чале пяцёркі рыцараў і 400 коннікаў. Скрытна, праз забалочаныя мясціны, прайшлі яны з дапамогаю правадніка і папалі на прыгарад. Абрабаваўшы яго, са здабычай спешна адышлі, але хутка войска Гедыміна дагнала крыжакоў і пабіла іх. Другі раз сабралася значная сіла - пяць тысяч коннікаў і шмат рыцараў павёў на Горадзен з Кенігсберга магістр Генрых фон Плоцке. У замку знаходзілася ў гэты час войска Гэдыміна, таму крыжакі пашчыравалі ў паваколлі і змянілі свой маршрут.

1324 г. На пачатку сакавіка, у Вялікі пост, тры рыцары і 600 воінаў з Натангіі28 зрабілі патаемны рэйд у ваколіцы Горадзена. Яны напалі на радавы маёнтак29 Давыда Гарадзенскага, забілі 38 чалавек, забралі хатнюю жывёлу і 100 коней. Верагодна, пры гэтым была забіта жонка і два сыны Давыда.

1328 г. Гросмайстру Тэўтонскага ордэна Вернеру Арсялену з атрадам з 60 рыцараў і 300 ратнікаў удаецца авалодаць Горадзенам пасля трохтыднёвай асады. Замак быў спалены, жыхары заплацілі вялікую кантрыбуцыю. Ваколіцы горада ў радыусе 6 міль былі спустошаны.

1362 г. На пачатку лета вялікі магістр Тэўтонскага ордэна Генінг Шындэкопф прывёў пад Горадзен атрад крыжакоў. Яны ўжо хацелі фарсіраваць Неман, калі раптоўна на іх напалі гарадзенцы. Гэта было зроблена так удала, што праціўнік адмовіўся ад сваіх намераў.

1364 г., люты-сакавік. Напад на Горадзен войска фон Ханаў з Лівоніі. Разам з ім 40 князёў-рыцараў з розных краін Еўропы. Гарадзенскі замак вытрымаў асаду, але, як адзначыў нават рыцарскі храніст, "крыжакі бесчалавечна спустошылі ваколіцы горада, уводзячы шмат людзей у няволю".

1373 г. Яшчэ адзін разбуральны паход крыжакоў.

1375, 1377, 1379 гады. Беспаспяховыя набегі Альберта фон Заксена, Тэадорыха фон Эльнера, крыжакоў-аўстрыйцаў.

1393 г. Пасля трохдзённай асады Гарадзенскі замак быў захоплены і спалены крыжакамі, шмат воінаў і жыхароў узята ў палон.

1402 г. Рыцары спрабавалі захапіць Горадзен, калі Вітаўт, вялікі літоўскі князь, быў у Кракаве. Зноў пацярпелі ваколіцы горада, захоплены палонныя і 300 коней. Гэта быў, відаць, апошні паход крыжакоў на Горадзен.

Як бачым, толькі тры разы крыжакам удалося захапіць Горадзен. Гэта адбылося таму, што горад меў добрыя ўмацаванні. Мясцовыя дойліды пабудавалі з каменя-валуна і плінфы мураваныя абарончыя сцены і вежы. Успомніце вежу каля ўвахода ў замак. Калі сёння вы прыйдзеце да Старога замка, звярніце ўвагу на мост, які вядзе да замкавай брамы. У часы крыжацкіх нападаў ён яшчэ больш выгінаўся дугою пад сцены замка і таму ўсе, хто ішоў па ім, траплялі ў зону абстрэлу з замкавых муроў, вакон і вежаў. Частка маста была пад'ёмнай і вечарам падымалася на модных ланцугах. Пры неабходнасці

28Натангія — рэгён Прусіі.
29У літаратуры называюцца Путрышкі, Верцялішкі, Давыдзішкі.

варта на брамнай вежы запірала ўваход сталёвай кратаўкай і зачыняла браму.

Значную ролю ў абароне Горадзена адыграў камендант (каштэлян) замка князь Давыд Даўмантовіч - сын нальшанскага30, а потым пскоўскага князя Даўмонта... Дваццаць пяць гадоў выдатны палкаводзец абараняў дарогу ў Панямонне. У 1314 г. ваяры Давыда Гарадзенскага (так яго называлі) дапамаглі Навагрудку знішчылі запасы на шляху адступлення крыжакоў, захапілі іх лагер, дзе перабілі ахову, узялі 1500 баявых коней, правіянт і ваенны рыштунак. У 1322 і 1323 гадах войска Давыда абараняла ад рыцараў Пскоў. Мужны князь не раз рабіў рэйды ў глыб Прусіі і Германіі, даходзячы да Брандэнбурга і Франкфурта-на-Одэры. Так было ў 1319 г., калі ваяры князя захапілі шмат палонных і ваеннай здабычы ў Вогеншторфе. У 1324 г. Давыд Гарадзенскі ў адказ за напад крыжакоў на яго маёнтак і забойства сям'і зрабіў набег на Мозовію — саюзніцу братоў-рыцараў — знішчыў г. Пултуск, спаліў 120 мястэчак і вёсак, зруйнаваў 30 касцёлаў і захапіў ў палон 4000 чалавек. У 1326 г. Давыд Гарадзенскі на чале 1200 коннікаў і з атрадам польскага войска здзейснілі спусташальны рэйд на Брандэнбург. У час вяртання з паходу князь зрабіў у Мазовіі прывал тут і напаткала яго раптоўная смерць. Польскі храніст XII ст. Мацей Стрыйкоўскі захапляўся адвагай ліцвінаў і з гараччу апісаў смерць Давыда Гарадзенскага: "Знайшоўся нейкі Анджэй, мазур, шляхтіц правы, бачачы сваёй Айчыны ўпадак крывавы, умяшаўся паміж ліцвінамі, як другі Сцэвола31 уваткнуў доўгую дзіду ў Давыда ў намеце".

Цела Давыда воіны прынеслі на шчытах дамоў і пахавалі ля сцен царквы Барыса і Глеба. Гарадзенцы насыпалі вялікі курган, ушаноўваючы ваенны талент славутага сына Гарадзеншчыны. Цяпер шуміць на гэтым месцы велізарны клён, а Нёман, што цячэ ля падножжа гары гамоніць з князем Давыдам:

Над Гародняй праходзяць стагоддзі,
А ты спіш у кургане, князь любы!
Помніць вораг твой меч...
Чуюць людзі —
Гудзяць гарадзенскія трубы.

(А. Цыхун)

30 Нальшанскае княства знаходзілася на тэрыторыі цяперашніх Ашмянскага і Смаргонскага раёнаў.

31Сцэвола Гай Муцій — рымскі юнак, які прабраўся ў лагер этрускаў, каб забіць цара Парсену.

Канец крыжацкім нападкам палажыла знакамітая Грунвальдская бітва. Цікава, што нямецкія гісторыкі называюць яе Таненбергскай, літоўскія — Жальгірыйскай, у беларускіх летапісах — гэта Дубровенская бітва. Супраць крыжакоў у ёй удзельнічалі аб'яднаныя сілы народаў Усходняй Еўропы: Польшчы, Беларусі, Украіны, Літвы, некаторых рускіх зямель, Чэхіі, Валахіі і іншых. Пра ўдзел беларусаў Ян Вісліцкі ў сваей "Прускай вайне" напісаў наступнае:

Вітаўт, праслаўлены брат караля,
Войска палкамі збірае,
Клічучы тых, хто ўрабляе слаўныя жытныя нівы
Краю, багатага пушчай бяскрайняй, азёрнай вод гладдзю,
Сеючых смерць беларусаў.

У Горадзене збіраліся Гарадзенская, Навагрудская, Лідская, Ваўкавыская харугвы32. "Сцягі ж вызначаныя такімі харугвамі, былі амаль аднолькавыя, — пісаў Ян Длугаш, — бо амаль кожная мела на сцягу ваяра ў даспехах, які сядзеў на белым, іншы раз чорным, або гнядым, ці пегім кане і патрасаў мячом у выцягнутай руцэ, на чырвоным полі". (Гэта вядомая "Пагоня").

Бітва адбылася 15 ліпеня 1410 г. у трохвугольніку вёсак Грунвальд-Танснберг (г. Стэмбарг)-Людвігсдорф (Людвігова) на ўзгоркавым полі плошчай каля чатырох квадратных кіламетраў, акаймаваным лесам і зарослай хмызняком балоцістай поймай р. Марта (цяпер Ольштынскае ваяводства Рэспублікі Польшча). Армія ордэна практычна перастала існаваць: большая яе частка была ліквідавана, значная колькасць папала ў палон. Пераможцам дасталіся сцягі крыжакоў - 51 адвезлі ў Кракаў, а астатнія у Вільню.

У лютым 1411 г. з Тэўтонскім ордэнам быў падпісан Торуньскі мір, па якому крыжакі абавязваліся не ваяваць супраць Польшчы і Літвы, не аб'ядноўвацца з іх ворагамі, выплаціць кантрыбуцыю ў 6 мільёнаў пражскіх грошаў. Такім чынам, Грунвальдская бітва спыніла агрэсію крыжакоў, падарвала магутнасць ордэна, аднавіць якую яму больш не ўдалося. У 1466 годзе ён быў ліквідаваны. Літва і Беларусь атрымалі магчымасць паспяховага эканамічнага развіцця.

...15 ліпеня 1990 г. на палях Грунвальда адбылася ўрачыстасць, прысвечаная 580-годдзю знакамітай бітвы. У складзе "беларускага войска" прымала ўдзел "гарадзенская харугва" прадстаўнікі Гродзенскага абласнога аддзела Беларускага фонда культуры і клуба "Паходня".

32 Харугва — вайсковая адзінка, полк, які ў сярэднім палічваў тысячу чалавек (200 конных і 800 пешых).

А 28 кастрычніка па Каложскай гары ў Гродне, быў адчынены памятны знак "Пагоня па Грунвальд". Паблізу насыпалі зямлю, дастаўленую з Ліды, Навагрудка, Ваўкавыска.

## ПАД УЛАДАЮ ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ

У сярэдзіне XIII стагоддзя для Горадзена настаў час новых выпрабаванняў. Пасля смерці ў 1241 г. апошняга гарадзенскага князя Юрыя Глебавіча, унука Усевалада Давыдавіча, горад стаў аб'ектам жорсткай барацьбы паміж галіцка-валынскімі і літоўскімі князямі. З сярэдзіны 40-х гадоў XIII ст. намаганнямі Міндоўга і Эрдзівіла 33 Горадзен увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага. У 1253 г. Даніїл Раманавіч, князь галіцкі захапіў горад пад сваю ўладу, але не на доўга, бо ўжо ў 1259 г. прыйшлося ваяваць за яго зноў. Пасля смерці Данііла Раманавіча ў 1264 г. Горадзен перайшоў да яго сына Шварна Данілавіча. Пасля смерці Шварна Уладзімір Васількавіч валынскі не змог утрымаць Горадзен і ў 1270 г. ён перайшоў у рукі літоўскага князя Тройдзена.

Каб умацаваць сваё становішча, Тройдзен пасяліў у Горадзене і Слоніме, збегшых ад крыжакаў прусаў. У 1277 г. галіцка-валынскія князі Мсціслаў, Юрый і Уладзімір паспрабавалі захапіць Горадзен, але няўдала. Летапіс сведчыць: "Столб бе бо камеи высок стоя пред вороты города. И бяху в иемь заперлися Прузы и не бысть имь мимо ігь паити к городу, побивахуць бо ѡ столпа того". Гэтыя радкі сведчаць, што ў Горадзене існавала вежа, падобная на знакамітую Белую вежу ў Камянцы. Гэты новы тып абарончых умацаванняў быў шырока распаўсюджаны ў Заходняй Еўропе пад назвай "данжон". Вядомы яны і па Вільні. Верагодна, што вежу-стоўп у Горадзене пабудавалі менавіта валынскія майстры.

Дзядзінец па-ранейшаму меў драўляныя сцены-горадні, па версе ішла баявая галерэя, прыкрытая брусверам-забаролам. Захаваліся яшчэ і мураваныя сцены XII ст. Асноўнай кропкай абароны стала мураваная вежа-стоўп. Яна знаходзілася побач з брамай дзядзінца і выступала за лінію сцяны. Гэтае зручнае месцазнаходжанне давала магчымасць абаронцам трымаць пад абстрэлам мост, браму і частку прылягаючай да брамы сцяны.

---

33Эрдзівіл - жамойцкі князь, які стаў наваградскім князем у 1240-я гады, пасля свайго бацькі Манувіла.
Міндоўг (? - 1263) - з 1246 (1247 ?) - наваградскі князь, у 1253-1263 гг. — кароль літоўскі, заснавальнік ВКЛ з цэнтрам у Навагрудку.

Аблога 1277 г. была апошняй спробай валынскіх князёў вярнуць Горадзен пад сваю ўладу. Міжусобіцы і пагроза мангола-татарскай навалы прымусілі іх зміРыцца са стратай. З гэтага часу Горадзен увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (ВКЛ). Унутранае становішча Княства было вельмі складаным. Раздзіраемае міжусобнымі войнамі літоўскіх князёў, яно было вымушана адначасова абараняцца ад моцнага і каварнага ворага — крыжакоў. Бесперапынныя войны, пастаянная пагроза знішчэння, зразумела, не спрыялі развіццю горада.

Археалагічныя раскопкі на Старым замку выявілі трохметровы культурны слой, які ўтварыўся за часы, калі Горадзен уваходзіў у склад ВКЛ. Ён бедны на знаходкі. Асноўную іх частку складае зброя, пераважна наканечнікі стрэл. Знаходак, якія б сведчылі аб стане рамяства, настолькі мала, што многія даследчыкі гавораць аб замаруджванні ці, нават, аб спыненні развіцця горада ў гэты перыяд.

Зразумела, што пры пастаяннай ваеннай пагрозе людзі больш клапаціліся аб захаванні ўласнага жыцця, будаўніцтве і падтрымцы ў належным стане гарадскіх умацаванняў. Гэта патрабавала значных намаганняў. Таму амаль ніякага адмысловага будаўніцтва ў тыя часы не вялося.

У 1312 г. гродзенскім каштэлянам стаў князь Давыд Даўмонтавіч, які здолеў абараніць горад ад крыжацкіх навал. Атрымаўшы доўгачаканы перадых у бесперапынных бойках з крыжакамі, гарадзенцы пачалі адбудоўваць свой горад. Менавіта ў гэты час, у канцы XIII -сярэдзіне XIV стагоддзя на дзядзінцы была пабудавана новая мураваная царква, якую цяпер называюць Верхняй. Яна паўстала на месцы загінуўшай у 1183 г. Ніжняй царквы.

Верхняя царква была невялікім, квадратным у плане храмам з адною паўкруглаю абсідаю. Вуглы сцен, як і ў ранейшых помніках гродзенскай архітэктурнай школы, былі зрэзаны пад вуглом 45 градусаў. Сцены былі зроблены з плінфы і вялікапамернай брусковай цэглы, пакладзеных па вапнавую расчыну[34]. У муроўцы сцеп выкарыстаны і шліфавальныя камяні, што сведчыць аб захаванні будаўнічых традыцый. Спачатку перакрыццё царквы было драўляным, а пасля перабудовы былі зроблены крыжовыя скляпенні, якія накрылі дахоўкаю.

У 1376 г. Горадзен становіцца валоданнем літоўскага князя Вітаўта. Менавіта гарадзенцы падтрымалі яго ў барацьбе з Ягайлам за

[34] Вапнавая расчына — раствор, зроблены з ванны, пяску і дробных каменчыкаў.

уладу ў ВКЛ. У выніку перамоў паміж Вітаўтам і Ягайлам у 1384 г. Горадзен становіцца другою сталіцаю ВКЛ. Разумеючы, што перамір'е гэтае не вельмі трывалае, Вітаўт пачаў рыхтавацца да новай вайны. Аднавіў і ўмацаваў сцены Старога замка, а таксама Ніжняга.

У 1390 г. Вітаўт заключыў дамову з крыжакамі для сумеснай барацьбы супраць Ягайлы і даручыў абарону горада маркграфу35 Зальцбаху. У тым жа годзе залога Гарадзенскага замка вытрымала 50-дзённую аблогу польскага каралеўскага войска на чале з Ягайлам. Прышоўшы з крыжакамі на дапамогу гарадзенцам, Вітаўт не здолеў супрацістаяць Ягайле. Той захапіў спачатку Ніжні, а потым і Стары замак.

У 1390 г. Вітаўт дазволіў крыжакам пабудаваць у сваіх валоданнях тры замкі: Метхенбург, Рутерсбердер і Ноенгартэн. Апошні знаходзіўся на левым беразе Нёмана, насупраць Старога замка. Праз год, пасля заключэння міра з Ягайлам, калі неабходнасць у падтрымцы адпала, Вітаўт захапіў і спаліў гэты замак.

Новае будаўніцтва на тэрыторыі Старога замка пачалося ў пачатку XV ст. У адну з начэй 1398 г. ад неасцярожнага карыстання агнём загарэўся палац. Разбуджаны прыручанай малпай, Вітаўт разам з жонкаю паспеў выскачыць з ахопленага агнём будынка. Але палац і іншыя пабудовы згарэлі ўшчэнт. Пасля пажару згарэўшыя рэшткі часткай разабралі, а часткай скінулі ўніз, а на іх месцы пабудавалі новыя мураваныя сцены. Падмуркі з вялікіх камянёў на расчыне заклалі на глыбіню аднаго метра. Магутныя сцены трохметровай таўшчыні былі зроблены з каменя і вялікапамернай цэглы і дасягалі вышыні 6-8 метраў. Агульная іх даўжыня — 220 метраў.

Замак меў пяць веж, чатыры квадратныя і адну круглую. Тры квадратныя вежы стаялі па вуглам замка. Ва ўсходняй вежы была зроблена брама з пад'ёмным мастом. Чацвёртая вежа знаходзілася пасярэдзіне звернутай у бок Нёмана. Круглаю вежаю з'яўлялася ўзгаданай вышэй вежа данжон.

Паміж круглай і паўночна-усходняй вежамі быў пабудаваны мураваны палац Вітаўта. Двухпавярховы будынак быў прыстасаваны да абароны. Сцяна, звернутая ў бок горада, мела вузкія вокны-байніцы. Да абарончых сцен прымыкалі гаспадарчыя пабудовы. Двор перад палацам і брамай быў выбрукаваны. Для свайго часу мураваны замак Вітаўта быў першакласным умацаваннем, здольным вытрымаць

35Маркграф - кіраўнік памежнай акругі.

любыя аблогі. У 1402 і 1403 г.г. крыжакі нават не спакусіліся яго штурмаваць, абмежаваўшыся толькі рабаваннем ваколіц.

Пасля перамогі аб'яднаных славянскіх войскаў пад Грунвальдам, Стары замак паступова страчвае абарончае прызначэнне і пераўтвараецца ў рэзідэнцыю князёў ВКЛ. Цэнтр эканамічнага і грамадскага жыцця горада паволі пераносіцца ў раён гарадскога рынка (сучасная плошча Савецкая). Сюды зыходзіліся сем вуліц з розных частак горада. Тут пачыналіся дарогі да Варшавы, Вільні і Смаленска. З заходняга боку плошчы знаходзіўся першы драўляны касцёл Прачыстай Маці Боскай, пабудаваны па загаду Вітаўта ў 1389 г. Тут жа на рынку знаходзілася ратуша, на першым паверсе якой знаходзіліся крамы і склады, а на другім зала пасяджэнняў магістрата. Да сярэдзіны XVI ст. планіроўка горада абмяжоўвалася руслам Нёмана і Гараднічанкі. Занёманскі пасад, узнікшы ў канцы XV ст. развіваўся ўздоўж дарогі на Варшаву.

Больш падрабязна аб выглядзе Горадзена ў гэтыя часы вы даведаецеся з наступных аповядаў і ілюстрацый.

## НА ПРАВАХ МАГДЭБУРГА

Наш горад здаўна ганарыцца еўрапейскімі традыцыямі. І гонар яго не беспадстаўны. Горадзен адзін з першых гарадоў Вялікага княства Літоўскага атрымаў права самакіравання — так званае магдэбургскае права. Юрыдычныя правы гарадоў на самакіраванне ўзніклі ў Заходняй Еўропе з канца XI стагоддзя як вынік барацьбы гараджан са сваімі сіньёрамі (біскупамі, феадаламі, каралямі) і паступова распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе.

Найбольш ранняя форма гарадскога самакіравання, якая склалася ў некаторых італьянскіх, французскіх і нямецкіх гарадах (Ліль, Тулуза, Амьен, Ворм, Кёльн і інш.), гэта камуна (ад познялац. communa абшчына) – выбары з ліку гараджан гарадской Рады і адказных асобаў, уласны гарадскі суд, гарадское апалчэнне, асобныя гарадскія фінансы і падаткаабкладанне. Права горада на самакіраванне сіньёр пацвярджаў хартыяй, па якой горад быў абавязаны штогод выплочваць сіньёру пэўную суму грошай — рэнту і падчас вайны выстаўляць войска. Цікава, што не ўсе, нават самыя вялікія гарады, такія як Парыж, карысталіся такім правам у поўным аб'ёме. Нярэдка сіньёр згаджаўся на частковае самакіраванне і тады выбарныя органы

дзейнічалі сумесна з чыноўнікам[36], які прызначаўся сіньёрам. Найбольш поўныя правы на самакіраванне атрымлівалі імперскія (каралеўскія) і біскупскія гарады. Менавіта ў гэтыя часы і ўзнікла нямецкая прыказка "Гарадское паветра робіць вольным".

Сярод еўрапейскіх гарадоў, якія паступова набывалі найбольш поўныя правы на самакіраванне, вылучыўся нямецкі горад на Эльбе Магдэбург (вядомы з 805 г., з 968 г. цэнтр Магдэбургскага архібіскупства). Пачаткам магдэбургскага права на самакіраванне, якое канчаткова склалася ў XIII ст. і паступова набыло шырокую вядомасць, былі прывілеі, якія даў у 1188 г. гарадскому патрыцыяту[37] тагачасны архібіскуп Віхман. Незвычайная папулярнасць менавіта магдэбургскага права тлумачыцца тым, што яно мела markdown рознабаковы, усеабдымны (універсальны) характар: тлумачыла розныя віды прававых зносін дзейнасць гарадской выбарнай улады, уласнага суда (яго кампетэнцыю і парадак судовай вытворчасці), пытанне зямельнай уласнасці ў межах горада, парушэнні ўладання, захопу рухомай маёмасці, устанаўлівала пакаранні за розныя віды злачынстваў і г. д. Асаблівае месца займалі нормы, якія рэгулявалі гандаль і рамёслы, дзейнасць цэхаў і купецкіх гільдзій, парадак падаткаабкладанняў. Для паўнаты інфармацыі зазначым, што ва Усходняй Прусіі дзейнічала т. зв. кульмінскае ці хельмінскае права, дзе вышэйшай судовай інстанцыяй быў суд у Хелмне (з 1251), а потым у Таруні (з 1466).

Узнікненне такога юрыдычнага статуса гарадоў (гарады з правам самакіравання) у Вялікім княстве Літоўскім напрыканцы XIV ст. з аднаго боку сведчыла, аб значнай ролі гарадскога насельніцтва ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці дзяржавы. З другога ж боку яно сведчыла аб зацікаўленасці гаспадароў у павелічэнні гэтай ролі. А гэта ўжо пэўны ўзровень мыслення кіраўніцтва. Прычым еўрапейскага мыслення. Бо інакш як зразумець, што манарх (ці феадал) добраахвотна (а ў ВКЛ гэта на самой справе рабілася з боку гаспадара дабравольна) вызваляе сваіх падданых ад уласнай залежнасці, ад рознага роду павіннасцяў і нават гарантуе ім (што значыць - бярэ пад сваю абарону) свабодныя заняткі рамяством, гандлем, земляробствам і нават дазваляе абіраць свой, самастойны і амаль што незалежны ад улады манарха орган кіравання горадам — магістрат, свой суд, ствараць рамесныя абяднанні цэхі.

---

36Нярэдка ён называўся намеснікам.
37Патрыцыят — вышэйшы, найбольш багаты пласт гарадскога насельніцтва сярэднявечнай Еўропы, які замацаваў за сабою асобныя правы і прывілегіі ў гарадской абшчыне.

Грамату па магдэбургскае права выдаваў (а называлася яшчэ больш урачыста — дараваў, бо на тыя часы гэта быў на самой справе самы каштоўны падарунак) вярхоўны ўладар (ці ўладальнік горада, калі горад належаў прыватнай асобе — феадалу). На Беларусі адпаведна — вялікі князь літоўскі ці магнат. Першымі гарадамі ВКЛ, якія атрымалі граматы (прывілеі) па магдэбургскае права, былі Вільня (1387), Бярэсце (1390) і Горадзен (1391). У гэты час вялікім князем літоўскім (з 1377 г.) быў Ягайла, сын Ольгерда. У 1382 годзе ў Крэўскім замку Ягайла забіў свайго роднага дзядзьку Кейстута (31 мая 1380 года Ягайла заключыў тайную замову з тэўтонскім ордэнам; зведаўшы пра гэта Кейстут адхіліў Ягайлу ад улады і абвясціў сябе вялікім князем; 12 ліпеня Ягайла здзейсніў пераварот, заняў Тракай радавы маёнтак Кейстута і паланіў дзядзьку разам з ягоным сынам Вітаўтам і нявесткай). Вітаўт, пераапрануўшыся ў адзенне служанкі сваёй жонкі Оны (Ганны), збягае да крыжаносцаў і, заручыўшыся іх падтрымкай, замацоўваецца ў Горадне уласным уладанні свайго бацькі. У 1384 годзе, пасля дамовы Вітаўта з Ягайлам Горадзен становіцца 2-й сталіцай ВКЛ.

Пачынаецца перыяд уздыму эканамічнага і культурнага жыцця горада (для заахвочвання гандлю Вітаўт будуе першы каталіцкі храм Горадзена — фару Вітаўта; 18 чэрвеня 1389 года дае грамату гарадзенскім яўрэям прывілей на права і вольнасці: "...бажніца і могілкі вызваляюцца ад падаткаў". У 1386 годзе Ягайла ажаніўся на польскай каралеўне Ядзвізе і стаў каралём польскім. Паступова абвастраюцца ягоныя адносіны з Вітаўтам і ў сакавіку 1390 года ўспыхвае вайна паміж стрыечнымі братамі.

Няцяжка ўявіць сабе матэрыяльныя страты горада і гараджан. Каб спрыяць адраджэнню Горадзена, Ягайла і даруе гараджанам прывілей на магдэбургскае права (1391 г.). Але гэта было няпоўнае, так званае Малое магдэбургскае права: гараджане вызваляліся ад упраўлення і суда феадала (у прыватнасці, гэта быў Вітаўт) і ад шэрагу феадальных павіннасцяў.

У 1413 годзе згодна з Гарадзельскай уніяй, у ВКЛ скасоўваюцца княствы і Горадзен становіцца павятовым горадам Трокскага ваяводства. Дакладных звестак не маем, але падобна па тое, што з канца 1391 года Горадзен рэальным правам на самакіраванне не карыстаўся, бо ў 1444 годзе вялікі князь літоўскі (з 1440 г.) Казімір Ягелонавіч даруе (а не пацверджвае) Горадзену магдэбургскае права (падчас свайго знаходжання ў Бярэсці). Вялікі князь Казімір лічыў Горадзен сярод 15 буйнейшых гарадоў ВКЛ. Па гэтаму прывілею гараджане

вызваляліся ад абавязкаў рамантаваць замкі і выконваць вазовую (надводную) павіннасць для дзяржаўных чыноўнікаў.

Усё вышэйазначанае Вы, шаноўны чытач, можаце знайсці ў любой сучаснай энцыклапедыі ці падручніку па гісторыі ці нават у папулярнай кніжцы. Але вось мы бярэм у рукі копію Прывілея 1496 г. "найяснейшага Аляксандра, князя літоўскага", якая захоўваецца ў беларускім дзяржаўным гістарычным архіве ў Гродне[38], і чытаем: "Мы, Аляксандр з ласкі божай вялікі князь літоўскі, рускі, жамойцкі і г. д., Гаспадар і Пераемнік Заяўляем словамі гэтымі каму належыць усім сучаснікам і потым будучым, якія аб гэтым вядомасць мець будуць: так як Мы ўзбагачэння паспалітага ўвесь час прагнучы і жадаючы, каб фінансавае становішча нашага Горадзена было лепшае і каб людзі яго насяляючыя парадкам добрым і слушным у сваіх уладаннях сталі багацейшымі... з Права Літоўскага ці Рускага і якога яшчэ раней атрыманага на Права нямецкае Майдэборскім празванае прызначаем, якое вечныя часы павінна цягнуцца згодна свайго поўнага і цэлага кшталту, адцясняючы адсюль усякае права раней атрыманае, і спосабы і звычаі ўсе існуючыя, якія б таму сапраўднаму праву Тэўтонскаму Майдэборскаму маглі перашкаджаць...". Праўда, копія гэта ў перакладзе са старажытнабеларускай на польскую мову 1830-х г.г. і мы вымушаны рабіць амаль што адваротны пераклад (што, аб'ектыўна кажучы, не карэктна). Але ў дадзеным выпадку ёсць аналаг — сапраўдны тэкст Прывілеі таго ж вялікага князя Аляксандра аб наданні магдэбургскага права Полацку (1498 г.[39]), у якім адпаведныя радкі гучаць так: "...Мы, Александр чиним знаменито тым нашим листом каждому, кому потреба его ведати, нынешним и напотом будучим: иж маючи взгляд к посполитого доброго размножению и хотячи положенье места нашого Полоцкого в мере лепшой поставаити, штобы люди наши, там живучыи, через вряд добрый а справедливый были размножены, тое место наше с права литовского и руского и которое, коли будет там держано, в право немецкое майдеборское переменяем на вечные часы и подлуг того-то права майдеборского, зуполного обычаю и сее уставы, отдаляючи тамже вси права, уставы и обычаи перво держаные, которые ж тое права майдеборское нагабають або перакажають".

[38] /фонд 1, вопісь 4, адзінка захоўвання 647, арк. 12-15/

[39] Жалованная грамота вел. князя Александра о предоставлении Полоцку магдебургского права // Белоруссия в эпоху феодализма Т. 1., Мн., 1959. с. 263-266.

Атрымліваецца, строга кажучы, што самакіраванне, якое надавалі гарадам ВКЛ Ягайла і ягоны сын Казімір было своеасаблівым і мела ўласную назву: Літоўскае (Рускае) права. І паколькі не толькі сапраўдных тэкстаў гэтых прывілеяў, але і нават спасылак на іх мы не маем, то лепш нам гэтымі заўвагамі абмежавацца і чакаць найноўшых даследаванняў.

Але маючы, нават у перакладзе на польскую мову, копію сапраўднага тэкста прывілею 1496 года, можна сцвярджаць, што сапраўднае магдэбургскае права надаецца Горадзену прывілеям вялікага літоўскага князя Аляксандра Казіміравіча ў Берштах - вялікакняжаскім двары, дзе на той час праходзіў сойм ВКЛ "у панядзелак у самы дзень Св. Бенядзікта[40] в лето вчеловечения 1496". Згодна з гэтым прывілеем гораду надаецца войтаўства і быў створаны гарадскі орган самакіравапня — магістрат, які адыгрываў ролю адміністратыўнай улады, судзебных і паліцэйскіх функцый, сачыў за гандлем, збіраў падаткі. Магістрату падпарадкоўваліся ўсе жыхары горада-места[41], акрамя тых, хто жыў у юрыдыкі[42]. Горад вызваляўся ад гандлёвых пошлін, агрымаў дазвол на пабудову ратушы "і тройчы ў год кожны кірмашы мець згодна з іх багаццем і згодна звычаю праводзіць. Першы на дзень свята падняцця Святога крыжа[43], другі на свята Святой Магдалены[44], трэці на свята Святога Андрэя[45]. А кожны з іх павійей цягнуцца тыдзень".

Магістрату прадпісвалася пабудаваць млын на Нёмане, тры карчмы, лазню, камяніцу для ўтрымання ў ёй вагаў,васкабойню, даходы ад якіх паступалі на карысць горада. Прывілей Аляксандра Казіміравіча вызваляў гараднян ад абавязкаў рамантаваць вялікакняскі замак, а таксама даваць падводы вялікакняскім чыноўнікам, акрамя выпадкаў, калі асобы прад'яўлялі адкрытыя лісты з вялікакняскай пячаткай. Гараднянe павінны былі вялікаму князю таксама "усе і кожны асобна несці трэці грош ад усякіх чыншаў46, працэнтаў, дараванняў, судоў,

---

[40] /11 ліпеня/

[41] Яны пазываліся мяшчанамі (ад тагачаснай назвы горада — места; уласна горадаму тыя часы лічыўся вялікакняскі замак).

[42] Юрыдыка — частка горада, якая знаходзілася пад уладаю прыватнай асобы або царквы ці кляштара і на якую не распаўсюджвалася ўлада магістрата.

[43] /1 верасня/

[44] /22 ліпеня/

[45] /30 лістапада/

46 Чынш (ад лац. Census- nepanic) грашовыя ці натуральным плацяжы феадальназалежных сялян-земляўласнікаў за карыстанне зямлёй.

він праўных і прыходаў якіх-кольвек", а таксама асвятляць шлях падчас вялікакняскага палявання.

У адпаведнасці з нормамі магдэбургскага права гараджане абіралі Раду (якая складалася з 11 радцаў) і Лаву (12 лаўнікаў) з ліку купцоў і заможных майстроў[47], цэхмістраў[48]. Бурмістраў, якія ўзначальвалі раду, было двое - праваслаўны і каталік. Іх мяшчане абіралі з ліку райцаў. Яны вялі пасяджэнні рады па чарзе і абіраліся штогод. Пасяджэнні рады праводзіў войт[49], які прызначаўся вялікім князем і быў вышэйшай судовай інстанцыяй у горадзе, узначальваў Лаву (войтава-лаўнічы ці магдэбурскі суд).

Такім чынам вялікі князь пазбавіў мяшчан ад падсуднасці ваяводам, старастам, княжаскім суддзям, падсудкам, цівунам і іншым вялікакняжаскім чыноўнікам, а права "судити и рядити" гарадзенскіх мяшчан даў войту і бурмістрам у прысутнасці райцаў. Гарадавы магістрат (бурмістрава-радны суд) разгледжваў справы паміж мяшчанамі, прызначаў анекуноў сіратам і непаўналетнім, ведаў справамі грамадзянскімі, а крымінальныя справы накіроўваў у войтава-лаўнічы суд. Апеляцыйныя скаргі накіроўваліся вялікаму князю, які пакінуў за сабою права найвышэйшай судовай інстанцыі, але агаварыў у прывілеі, што мяшчан і самога войта ён абавязваецца судзіць па законах магдэбургскага права.

Месціўся магістрат у ратушы. Да пачатку XIX стагоддзя гэта была драўляная пабудова (1496 года) з рысамі рэнесансу, якая знаходзілася на Гандлёвам пляцу (Рынку, зараз Савецкая плошча). На вежы ратушу ўпрыгожваў гадзіннік — гордасць усяго горада. У 1807 годзе, калі замест старога будынка ўзвялі новы каменны комплекс ратушы з гандлёвымі радамі (у стылі класіцызму), гадзіннік перанеслі на адну са званіц Касцёла Францыска Ксаверыя (Езуіцкі кляштар), дзе ён захаваўся да нашага часу.

Найвялікшай каштоўнасцю, здабыткам магдэбургскага права для горада з'яўляецца гарадскі герб, выява якога, згодна з прывілеям вялікай княгіні літоўскай і каралевы польскай Боны (1540) упрыгожвала гарадскую пячатку. Як сімвальнае ўвасабленне вольналюбівага характару Горадзена-Гродна адзіны і нязменны герб горада — выдатнейшы помнік культуры — і сёння з'яўляецца яскравым напамінам аб гэтых "векапомных днях".

---

47 Майстры — кіраўнікі вытворчага працэса ў цэхах.
48 Цэхмістр — глава рамеснага цэха.
49 Пазней была ўведзена пасада ландвойта - намесніка войта.

# ВІЗІТНАЯ КАРТКА ГОРАДА

Яшчэ зусім нядаўна візітнай карткай Гродна — яго гербам — лічылі выяву зубра. Яго можна было сустрэць на вырабах гродзенскіх прадпрыемстваў, на паштоўках, вымпелах, у кнігах па гісторыі Гродна, у застаўках Гродзенскага тэлебачання. Але фактычна горад не меў свайго герба, бо зубр ніколі не быў афіцыйна зацверджаны, як герб Гродна, а з'яўляўся гербам Гродзенскай губерні. Ішло гэта яшчэ з царскіх часоў. Калі ў 1802 годзе пачалося існаванне Гродзенскай губерні, ёй надалі герб, у якога ў верхняй частцы шчыта была "Пагоня" (скасавана ў 1845 г.), а ў ніжняй "звер зубр". Гарадскога ж герба не было, бо ў 1859 г. распрацаваны праект яго не быў зацверджаны сенатам — тады вышэйшым дзяржаўным органам Расійскай імперыі.

Наданне гораду герба сведчыць аб пэўным дзяржаўна-палітычным і сацыяльна-прававым узроўні населеннага пункта. Горад атрымліваў герб толькі тады, калі меў самакіраванне, а яно давалася яму магдэбургскім правам. Горадзен атрымаў поўнае магдэбургскае права ў 1444 г. А ў 1540 г. другая жонка Сігізмунда І Старога Бона Сфорца дала гораду прывілей, згодна якому гарадзенскаму войту і магістрату дазвалялася мець сваю гарадскую пячатку падобна пячатцы горада Любліна.

У той час на пячатцы гэтага горада была выява казла, які абгрызаў вінаград, а на ваяводскай - выява белага аленя з каралеўскай каронай на шыі. У 1541 г. Бона новым прывілеем напомніла кіраўніцтву Горадзена аб неабходнасці завесці новую пячатку. Падкрэслім, што каралева пісала ў прывілеі пра новую пячатку — значыць горад ужо меў нейкую візітную картку? Якую ж? Польскі гісторык Юзэф Ядкоўскі лічыў, што першым гербам Горадзена магла быць пячатка вялікага князя літоўскага Вітаўта з выявай "Пагоні".

Першыя з вядомых гарадзенскіх пячатак (яны датаваны 1540 і 1565 гадамі) былі, відаць, зроблены ў Любліне. На іх была выява залатога аленя з залатым крыжам паміж рагамі. Алень пераскокваў праз агароджу. Як бачым, у Гарадзенскім гарадскім гербе, як і ў Люблінскім (ваяводскім), намаляваны алень, аднак гэта няпроста перанос выявы з чужога герба ў свой асабісты.

Вядомы астролаг Павел Глоба лічыць, што сонца на момант заснавання горада знаходзілася ў восьмым градусе Рака — градусе, які сімвалічна звязаны з незвычайнай жывёлай сернай з златымі рагамі. А паколькі серна невядома для гарадзенскай мясцовасці, таму ў герб трапіў алень. Восьмы градус рака з'яўляецца таксама сімвалам пераадольвання перашкод, скачком цераз бездань.

З'яўленне ў гербе Горадзена аленя, пераскокваючага праз агароджу, было звязана з адным з асноўных заняткаў гараджан - паляваннем. Спрыяла гэтаму тое, што горад знаходзіўся паблізу Гарадзенскай і Белавежскай пушчаў. Сярод паляўнічых трафеяў асноўнае месца займалі алені. Гэта сцвярджаецца археалагічнымі раскопкамі 1937-1939 і 1949 гадоў: 57% знойдзеных касцей належала дзікім жывёлам. Сярод беларускіх гарадоў гэта характэрна толькі для Горадзена. Косці высакароднага аленя складаюць 25% , а дзіка, касулі, зубра, бабра, ласяя значна менш.

Агароджа на гербе з'явілася таксама нездарма. Паляўнічыя будавалі падобныя збудаванні для таго, каб перагарадзіць зверу дарогу. Побач капалі лоўчыя ямы і рабілі засады. Алень, які пераскокваў праз агароджу, станавіўся недасягальным для паляўнічых, вольным. Відаць, узяўшы яго выяву ў свой герб, гарадзенцы хацелі тым самым падкрэсліць свой вольналюбівы характар. Бо алень гэта і сімвал воіна, перад якім бяжыць вораг. Успомніце, што вы прачыталі ўжо пра назву горада.

Алень — любімы персанаж і вобраз баек, паданняў, легенд, калядных і вясельных песень. Яго называлі цудоўным і дзівосным зверам, турам-аленем. У язычніцкай, а затым і ў хрысціянскай веры алень лічыўся сімвалам Сонца, выратавальніка, апосталаў або святых. У 41 псалме алень сімвалізуе душу. Сімвал аленя з крыжам паміж рагамі атрымаў шырокае распаўсюджанне ў жыціях святых.

Алень у гербе Горадзена звязаны з імем святога Губерта. Касцельная энцыклапедыя (1907 года выдання) падае дзве версіі яго паходжання, жыцця і дзейнасці жыцейскую і легендарную. Губерт - сын Бертрана, герцага Гіенскага (ці Бертранда, князя Аквітаніі) па адной з версій быў чалавекам добрапрыстойным і веруючым. Ён вучыўся ў біскупа Ламберта і стаў яго пераемнікам. Свае маёнткі раздаваў бедным і ўбогім; праславіўся як выдатны народны прапаведнік. На месцы забойства Ламберта Губерт пабудаваў касцёл, дзе змясціў рэліквіі свайго патрона50. Сам памёр у Фары пад Бруселем 30 мая 728 года. Прах яго знаходзіцца ў касцёле св. Пятра ў г. Льежы.

Па другой версіі, Губерт быў чалавекам бесклапотным, філасофстваваў і вольны час праводзіў на паляваннях. І вось аднойчы, у час палявання, з'явіўся яму алень з крыжам паміж рагамі і пачуўся голас: "Калі шчыра не выправішся, дык хутка пойдзеш у пекла". Моцна здзівіўся Губерт, злез з каня і пачаў горача маліцца.

---

50Патрон - апякун, абаронца.

Пасля здарэння ён склаў з сябе ўсе пасады, папрасіў благаславення ў біскупа Ламберта і сем гадоў правёў у Ардэнскіх гарах, як наломнік-скіталец. Там Губерт ізноў пачуў голас: "Губерт, пакінь адзіноту і ідзі ў Рым!". Так ён і зрабіў. Слухаў там рэчы папы рымскага Сергія I, які пасля смерці Ламберта прызначыў Губерта біскупам. На гэтай пасадзе Губерт прапаведаваў хрысціянства, абараняў убогіх і жабракоў за што і быў абвешчаны святым.

З той далёкай пары 3 лістапада адзначаецца як дзень св. Губерта. З X стагоддзя Губерт упамінаецца як апякун паляўнічых. У сярэднявеччы ў Баварыі, Чэхіі, Багеміі, Францыі існавалі рыцарскія ордэны святога Губерта.

Алень на гербе Горадзена мае паміж рагамі залаты крыж сімвал ісціны, веры, чысціні помыслаў, мудрасці і ўрадлівасці. Залаты колер сімвалізуе багацце, справядлівасць, вялікадушнасць.

Блакітны шчыт — сімвал прыгажосці, велічы, мягкасці. Спалучэнне залатога і блакітнага колераў павінна было яшчэ больш падкрэсліць, што горад будзе працвітаць "ва славу і ўгоду бога".

Гарадскія пячаткі зафіксавалі розныя выявы герба. На пячатках з датамі "1540" і "1565" (знойдзеных адпаведна на дакументах за 1633 і 1575 гады) адлюстраваны алень з крыжам паміж рагамі, які пераскоквае праз агароджу. На пячатцы "1640" (па дакуменце за 1652 г.) агароджы няма. Можа гэта было звязана з выкарыстаннем на паляванні агнястрэльнай зброі? Па дакументах за 1718 і 1784 гады на гербе паміж рагоў няма крыжа, а замест агароджы — контуры трох узгоркаў. Магчыма, яны ўказвалі па месцазнаходжанне Горадзена на трох узвышшах (там, дзе знаходзяцца Каложа, Стары замак, Бернардзінскі касцёл). На пячатцы з датай "1540", якая выяўлена на дакументах за 1772-1791 г.г., выкананы алень з крыжам, пераскокваючы праз агароджу па фоне трох кустоў.

Герб Горадзена з выявай аленя праіснаваў больш чым 250 гадоў. У 1801 г. ён спалучаўся з двухгаловым арлом, на грудзях якога быў шчыт з "Пагоняй", а па баках — скіпетр і дзяржава. З утварэннем Гродзенскай губерні горад страціў свой герб, хаця па "Даравальнай грамаце гарадам" Кацярыны II мог яго мець.

Указам ад 5 ліпеня 1875 г. губернскім гербам быў зацверджаны "залаты зубр з чорнымі вачыма і языком" на чырвоным полі шчыта. Ім сталі карыстацца і ў якасці гарадскога. Так было да 1919 г., калі польскія ўлады вярнулі герб з выявай аленя св. Губерта. У 1939 г. ён зноў прапаў амаль на паўстагоддзя.

У 1987 г. выканкам Гродзенскага гарсавета народных дэпутатаў аб'явіў конкурс на распрацоўку герба горада. 15 чэрвеня 1988 г. ён

быў зацверджаны рашэннем выканкама: "Герб г. Гродна мае форму выразнога раннегеральдычнага шчыта; фон шчыта выкананы ў выглядзе флага Беларускай ССР... на фоне намаляваны залаты алень, пераскокваючы праз агароджу; шчыт абведзены залатой паласой" (аўтары - мастак С. У. Ільін, архітэктар — Б. Л. Фралоў). Такім чынам герб XVI ст. быў падноўлены: не стала залатога крыжа, а заззяла чырвоная зорка, колер шчыта з блакітнага пераўтварыўся ў чырвоназялёны. І толькі трэцяя сесія Гродзенскага гарсавета ў 1990 г. аднавіла першапачатковы выгляд герба XVI ст.

... Слова "герб" запазычана з польскай мовы і сустракаецца ў многіх славянскіх дыялектах у значэнні "спадчыннік" або "спадчына". Старажытны герб завяшчае нам высакароднасць, вялікадушнасць, справядлівасць, багацце і працвітанне. Ну а ворагам няхай напамінае, што мы можам і пастаяць за сябе!

## "ПРАЎДЗІВАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ ГОРАДА..."

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна нам удалося знайсці невялікую, але вельмі цікавую працу сакратара Гродзенскага статыстычнага камітэта П. Дзікава пра гравюру51 Цюндта, фотаздымак якой вісеў у губернатара. У выніку двухгадовых даследаванняў ён прыйшоў летам 1887 г. да высновы, што "эстамп52, які адлюстроўвае г. Гродна, існуючы цяпер не больш 3 ці 4 экземпляраў у Еўропе, куплены ў 1879 годзе імператарскай публічнай бібліятэкай у кігагандлёўца Копа ў Берліне за 200 марак". Мы можам нават удакладніць, што купіў яго У. В. Стасаў — вядомы рускі мастацкі і музычны крытык. Ён першым увёў гравюру Цюндта ў навуковы абарот, выкарыстаўшы яе ў артыкуле аб праваслаўных царквах у Заходняй Расіі XVI стагоддзя.

Эстамп, пра які пісаў П. Дзікаў, быў памешчаны ў раму і меў паясняльны тэкст па-нямецку. Сярод іншага там было напісана: "А тое, што тут адлюстравана, адбывалася ў ліпені месяцы 1567 года. Намалявана яно Гансам Адэльгаўзерам і награвіравана Мацвеем Цюндтом Нюрэмбергскім грамадзянінам у 1568 г.". Ганс або Ян Адэльгаўзер — нямецкі мастак, які ў тэты час жыў і працаваў у Польшчы. Вядома толькі адна яго карціна "Выгляд Гродна з выяздам

---

51Гравюра — від графікі, пры якім адлюстраванне з'яўляецца друкаваным адціскам рэльефнага малюнка, нанесянага на дошку граверам.
52Эстамп - станкавая гравюра або літаграфія.

пасольстваў падчас сейма53 ў Гродна ў 1567 г.". Адэльгаўзер быў сведкаю намаляванай ім падзеі. Мацвей (Матэуш, Маціас) Цюндт (1498-1586) - вядомы нюрнбергскі мастак, залатых спраў майстар, картограф, гравёр. Акрамя гравюры, зробленай па малюнку Адэльгаўзера "Праўдзівае адлюстраванне Гродна ў Літве", вядомы яго гравіраваныя партрэты, гравюры з выглядамі гарадоў і карт Мальты, Венгрыі, Бельгіі, Фландрыі, Кіпра.

Калі ж і з якой нагоды ўзніклі малюнак, а потым гравюра? На першым плане яе вы бачыце Занёманскую частку горада, запруджаную людзьмі ў войскавых строях і з ваенным рыштункам на конях. Не, гэта не насельніцтва Гродна высыпала па вуліцу. Справа ў іншым. Вы — сведкі сустрэчы 24 ліпеня 1567 г. пасольства Маскоўскага княства да вялікага князя літоўскага і караля польскага Сігізмунда Аўгуста. Каралеўскі маршалак54 Іван Валовіч і галава маскоўскага пасольства Фёдар Іванавіч Колычаў (Разумны)55 падаюць адзін аднаму рукі. Паслухаем, што яны гавораць, калі ўжо сышлі з коней пасля невялікай спрэчкі аб тым, хто павінен гэта зрабіць першым (для стварэння каларыту захаваем мову арыгінала):

Валовіч: "Великий государь Жигимонд Август..., ведая Вас брата своего Ивана Васильевича Всея Руси и Великого Князя Московского великих послов, послал нас вас встретити и двор указати, где вам стояти и до подворья вас проводит".

Колычаў: "Государь наш Царь и Великий Князь Государя вашего послов жалует на встречу к ним, поклон приказывает и о здоровых вспросити велит. А нас Государь Ваш тем обезчестил — поклона не приказал и о здоровье нас вспросите не велел".

Валовіч: "Мы ваши речи донесем до Государя своего".

Затым маскоўскае пасольства было размешчана на Зарэцкім пасадзе дзесяць двароў пад вартаю ў дзень і ноч, каб ніхто не змог з іх выйсці.

Ішла вядомая Лівонская вайна (1558-1583 г.г.), у якой Іван IV імкнуўся "прасячы акно ў Еўрогіу". У сярэдзіне 1560-х гадоў у абоіх ваюючых бакоў узніклі імкненні скончыць вайну мірам. У чэрвені 1565 г. польска-літоўскае пасольства пабывала ў рускага дара, але перамовы скончыліся беспаспяхова, таму што Іван IV не хацеў вяртаць

53 Сейм (поль, sejm) — саслоўна-прадстаўнічы орган (парламент) у Літве, Польшчы і некаторых іншых краінах.

54 Маршалак - вышэйшая пасада ў ВКЛ і Польшчы.

55 Колычаў - найвыдатнейшы апрычнік, акольнічы, давераны царскі даручэнец

Полацк. Ён паабяцаў прыслаць сваё пасольства ў Польшчу. Вось яно і прыехала ў ліпені 1567 года ў Горадзен, дзе ў гэты час праходзіў сейм.

26 ліпеня маскоўскія паслы, а акрамя Колычава, гэта яшчэ полацкі намеснік Рыгор Іванавіч Нагі, дзяк Васілій Якаўлевіч Шчалкалаў і дваране усіх 1200 чалавек, былі ў караля "на пасольстве". На гравюры відаць як яны ідуць праз мост да Сігізмунда Аўгуста. Царскія пасланцы хацелі прымусіць яго ўступіць Маскоўскаму княству Полацк, прызнаць царскі тытул маскоўскага князя, заключыць пераміp'е, выдаць збегчага ў ВКЛ князя Андрэя Курбскага, дазволіць йпраезд рускіх купцоў Глядава і Кіткова праз Польшчу ў Царград, Александрыю, на Сінай і "ва Святую Гару". Перамір'е было заключана, але з астатнімі ўмовамі польска-літоўскія паслы пагадзіцца не маглі. На гравюры відаць таксама, што ў Горадзен прыехалі і іншыя паслы. Адэльгаўзер, каб адзначыць гэты факт, зрабіў памылку, намаляваўшы іх прыезд і сустрэчу адначасова з маскоўскім пасольствам. На самой справе было інакш: раней усіх прыбылі маскоўцы56 (яны намаляваны ўнізе карціны), за імі - пасланцы турэцкага султана Сулеймана II (у крайнім левым вуглу), а потым ужо татарскага хана Даўлет-Гірэя і Валахіі (на правам беразе ракі).

Другой важнай тэмай Гарадзенскага сейма была падрыхтоўка да канчатковага аб'яднаиня Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. Пасля таго, як Іван IV стаў Жахлівым і ўвёў апрычніну57, Маскоўскае княства перастала вабіць беларуска-літоўскую шляхту, як альтэрнатыва Польшчы ў гэтым пытанні. Тайныя перамовы шляхты ВКЛ з рускімі пасламі, якія маглі мець месца ў Горадзене (не здарма ж так сцераглі ліцвіны рускія двары), відаць, ўпэўнілі ў неабходнасці ўніі з Польскай дзяржавай. Што і было зроблена на вядомым Люблінскім сейме 1568-1569 г.г.

А цяпер зноў вернемся да гравюры, бо яна з'яўляецца гістарычнай крыніцай не толькі па палітычнай гісторыі Гродна. Больш 420 гадоў нясе яна нам інфармацыю аб розных сферах жыцця сярэднявечага горада: ягонай планіроўцы, развіцці гаспадаркі, энтаграфіі, ландшафце, архітэктуры.

---

56Дзікаў зрабіў запіс з кнігі "Достоверные портреты масковских государей Иоанна III и Иоанна IV (СПб., 1886): "А в Городенъ послы пришли после Ильина дня в первый четверг июля 24 дня, а встреча была у Городня от посаду с версту..."

57Апрычніна - карная сістэма ўнутрыпалітычных мер у 1565-1572 г. для барацьбы з магчымай здрадаю ў асяроддзі феадалаў (масавыя рэпрэсіі, казні, зямельныя канфіскацыі і г. д.)

Спачатку агульныя назіранні. Уверсе гравюры знаходзіцца надпіс на лацінскай мове "Vera dcsignatio urbis in Littavia Grodnae", што ў перакладзе на беларускую мову азначае: "Праўдзівае адлюстраванне горада ў Літве Гродна". Побач, у цэнтры, мы бачым герб, як і падтрымліваюць лятучыя анелы. Але гэта не гарадскі герб, а цэлая калекцыя гербаў: Каралеўства Польскага (арол), ВКЛ ("Пагоня"), г. Навагрудка (святы Гаврыіл з вагаю і мячом), Боны Сфорцы58 (змяя). Злева, у картушы59, прысвячэнне па-нямецку: "Яснавельможнаму і ўсемагутнаму Гасудару Сігізмунду Аўгусту, Каралю Польскаму і Вялікаму князю Літоўскаму, наследнаму правіцелю Расіі і Прусіі, майму міласціваму Папу". Справа, у картушы, надпіс па-нямецку гучыць: "Праўдзівае адлюстраванне горада Гродна ў Літве. Там яго Польская Каралеўская Высокасць трымала сейм...".

Георг Браўн у сваёй шырокавядомай працы "Гарады зямнога свету", выдадзенай у 1617 г., напісаў пра Горадзен, дзе ён пабываў папскім легатам60 наступнае: "Пасля Вільні, другі па важнасці горад у Літве ёсць Гродна, на р. Кроной, ныне называемай Ніему. Горад гэты пабудаваны часткова на гары, часткова ў даліне, па звычаю краіны. У ім вельмі мала дамоў, якія цягнуліся б запар, шчыльна пабудаваныя адзін да аднаго, мала дамоў цягляных, больш збітых проста з барвеняў. Горад не акружаны сцяною, не ўмацаваны, без брамы і без крэпасных сцен...".

Усё гэта мы бачым на гравюры Цюндта. Паглядзіце на раку. Прачытайце дзве яе назвы. Заадно заўважце, што Адэльгаўзер двойчы памыліўся: рака цячэ не ў той бок, ды яшчэ і падзяляе Каложскую і Замкавую горы (а на самай справе гэта робіць Гараднічанка). Па Кронану-Нёману плыве лодка с пасажырамі. На правым беразе мыюць і сушаць скуры гарбары. Можна ўбачыць таксама хатнюю жывёлу (кароў, коней, сабак) і птушку (пеўня з курамі).

Горад размяркаваўся на двух берагах ракі. Звязаны яны былі драўляным мастом, які меў пяць пралётаў. Памост умацоўваўся на гараднях і не меў бакавых агароджаў. З боку Старога замка знаходзілася чатырохкутная брама, дзе ажыццяўляўся збор маставога мыта. Бераг каля яе абведзены паўкальцом кароткіх паляў.

---

58Бона Сфорца - жонка вялікага князя літоўскага і караля польскага Сігізмунда Аўгуста Старога.
59 Картуш - упрыгожванне ў выглядзе дэкаратыўнага, акаймаванага шчыта або паўразгорнутага скрутка.
60Легат папскі -тытул вышэйшых дыпламатычных прадстаўнікоў Ватыкана.

На вуліцах прадмесця стаяць у нацыянальнай вопратцы гарадзенцы. Паказаны жылыя дамы — у асноўным чатырохкутныя драўляныя пабудовы з двухскатнымі дахамі, з акенцамі амаль пад дахам. Уваход быў у тарцах, зрэдку ў бакавых сценах. Над ім часта рабілі прамавугольныя або круглыя аконныя праёмы, невялікія аднаскатныя навесы. Верагодна, пад жыллё выкарыстоўвалі і паддашак, які асвятляўся круглымі або паўкруглымі вокнамі ў тарцавых шчытах і слухавымі вокнамі ў даху. Пераважалі дамы з курнымі нечамі, але былі і з дымаходамі. Існавалі рознага роду прыбудоўкі. Дамы намаляваны жывапіснымі групамі. Паміж дамамі відаць праходы ў двары, парою аформленыя арачнымі праёмамі і навесамі. На левым беразе Нёмана ёсць пабудовы "пруcкага мура" - драўлянага каркаса з цагляным, або глінабітным запаўненнем.

А цяпер злева направа паглядзім, што было на правым беразе Нёмана. Каложская царква пра яе вы ўжо чыталі асобны аповяд, таму звернем увагу, што мастак даў яе некалькі схематычна. Каля царквы вы бачыце праваслаўныя могілкі. Тут быў пахаваны Богуш Багутовіч, які ў пачатку XVI стагоддзя аднаўляў Каложу.

Асаблівую ўвагу прыцягвае Стары замак часоў Вітаўта. У 80-90-я гады XIV стагоддзя ён быў перабудаваны з камення і цэглы. Замак абведзены мурам, які мае з боку Нёмана 120 метраў даўжыні, ля Гараднічанкі — каля 90 метраў, а з боку горада — з двух частак на 46 і 24 метра. Таўшчыня сцен да 2,5-3 метраў. На гравюры наказана 4 вежы, якія захаваліся да сярэдзіны XVI ст., а першапачаткова іх было 5: адна круглая каля брамы (вы яе ўжо ведаеце) і 4 квадратовыя 12х12 метраў. Жылы дом князя быў аднапавярховым і меў памеры 45х15 метраў.

На суседнім узвышшы намаляваны руіны мураваных сцен Ніжняга замка. А вялікі будынак - гэта так званы "Каралеўскі дом", пабудаваны каля сярэдзіны XV стагоддзя. Паблізу мы бачым помнік гарадзенскай школы дойлідства Прачысценскую царкву. Яна знаходзілася на Падзамчышчы, але Адэльгаўзер сказіў перспектыву і вывеў царкву на адну лінію з замкам.

Правей стаіць Фарны касцёл. Гэта не сённяшні Фарны (паезуіцкі) касцёл, а былая Фара Вітаўта, пабудаваная да 1389 г. з дрэва, а з 1586-1587 г.г. з цэглы. Падмуркі яе вы можаце пагладзець у невялікім скверыку каля Палаца тэкстыльшчыкаў. Названы касцёл — самы стары каталіцкі храм у Гродне.

Побач намалявана ратуша, якая знаходзілася на гарадскім рынку. Спачатку яна была драўлянай, а ў першай чвэрці XIX ст. была пабудавана цалкам з каменяў. Гэта быў двухпавярховы будынак. На

першым паверсе знаходзіліся "жыллё або каморы для падстрыгання сукна", на другім службовыя памяшканні магістрата. Наверсе была зроблена вялікая тэраса.

Справа ад ратушы мы бачым Сімеонаўскую царкву — мураваны прамавугольны ў плане трохнефавы храм. Незвычайным было тое, што яна не мела алтарнай абсіды. Далей на ўзвышшы — два паралельных доўгіх будынка пад высокімі двусхільнымі дахамі. Гэта каралеўскія канюшні. Амаль па самым краю гравюры намалявана шыбеніца — "месца, дзе караюць злачынцаў" (так напісана ў прывілеі на магдэбурскае права 1496 г.). Яна знаходзілася за ўсходняй ускраінай горада, каля гарадскога лугу. Адэльгаўзер намаляваў, як па дарозе коннікі гоняць да шыбеніцы злачынцу.

На Падоле, недалёка ад Немана, стаіць яшчэ адна драўляная царква. Належала яна цэху гарадзенскіх гарбароў і называлася Праўдзівага Крыжа (Честного Креста). Упершыню ў дакументах царква ўзгадваецца каля 1480 г. Асаблівасцю яе была цэнтрычнаярусная кампазіцыя, у якой кожны уступны ярус быў меншым за папярэдні. Царква завершала купалам, над першым ярусам зроблена галерэя. Своеасаблівымі былі вокны — круглыя, з вялікай колькасцю шкельцаў.

Вось мы і даведаліся, што памаляваў Адэльгаўзер і выгравіраваў Цюндт. Іх праца на працягу каля 450 гадоў была ўзорам для наступных выданняў гравюр горада Гродна. Першымі наслядоўнікамі сталі Георг Браўн (мы яго цытавалі) і Франц Гогенберг[61]. У шасцітомнай працы "Гарады зямнога свету" (1572-1618 г.г.), у другім томе пад назваю "Аб самых галоўных усяго свету гарадах" (кніга 2) Браўн змясціў акварэльны афорт Гродна, зроблены Гогенбергам па гравюры Цюндта.

Ззаду гэтай новай гравюры быў даволі значны надпіс, але мы працытуем толькі невялікі кавалачак: "Літва - вялізная краіна, якая мяжуе з Польшчай, багністая, лясістая; сталіца яе Вільна, епіскапскі горад, такі ж па велічыні, як і Кракаў з усімі прадмесцямі. Нешмат яму ўступае горад Гродна на рацэ Кронан, цяпер называемая Неман, размеркаваны, па звычаям гэтай краіны, часткаю на ипагорках, часткаю на раўніне..."

Капіравалі гравюру Цюндта і іншыя майстры ў самых розных варыянтах: з пасольствамі і без іх, нават апускалі Каложу і каралеўскі палац. У такіх выглядах гравюра з'яўлялася ў творах А. Альбіцыўса (1608 г.), Ф. Валегіта (1610 г.), Г. Бодэнэра і іншых.

---

[61] Браун Г. — канонік, тэолаг, уладальнік выдавецтваў Кельне, кнігавыдавец і вандроўнік; Гогенберг Ф. -рэзчык карт з Мехельна, папскі легат у Гродна каля 1593 г.

Мы, сённяшнія гродзенцы, дзякуючы ім, маем магчымасць убачыць выяву нашага горада XVI ст. і параўйаць яе з рэальнасцю.

## ШТО МОЖНА ПАЧЫТАЦЬ
## КНІГІ АГУЛЬНАГА ХАРАКТАРУ:


Гостев А. П., Швед В. В. Кронон. Летопись города на Немане. 1116-1990. Гродно, 1993.
Граблевский И. С. Гродно и окрестности: справочник-путеводитель. — Мн., 1987.
Гродно (исторический очерк). — Мн., 1960.
Гродно (исторический очерк) / Под ред. З. Ю. Копысского и Б. М. Фиха. Мн., 1964.
Гродно-Grodno / Текст И. И. Ковкеля, Я. Н. Марата. -Мн. 1987.
Гродно. Энциклопедический справочник. — Мн., 1989.
Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. Ми., 1986.
Мараш Я. Кароткі нарыс гісторыі горада Гродна//Альманах "Неман". -Гродно, 1956 № 1 С. 157-178.


**НАРАДЖЭННЕ ГОРАДА**


Воронин Н. Н. Древнее Гродно. М., 1954.
Гуревич Ф. Д. Древние города белорусского Понеманья. — Мн., 1982.
Краўцэвіч А. К. Гродзенскі замак. Мн., 1993.
Царук В. Н., Таран Л. К. Городио, открытый археологами// Краязпаўчыя запіскі. Зб. артыкулаў памяці Ю. Ядкоўскага. Гродна, 1990. С. 24-29.


**ІМЯ ГОРАДА**


Госцеў А. П. Гародня свабодалюбівая//Чырвоная змена 1989 14 студзеня С. 7.


**ГАРАДЗЕНСКАЕ КНЯСТВА**


Гайдук М. Паратунак. Гістарычнае эссе. Мінск, 1993.
Госцеў А. П. Ізяслаў Мікуліч - князь Навагародскі// Навагародскія чытанні. Частка 2. Навагрудак, 1993 С. 3-6.
Госцеў А. П., Швед В. В. Шлюб князя-ізгоя, або як пачынаўся Горадзен//Гродзенская праўда 1991 1 лістапада. С. 3.
Рассказы Начальной русской летописи/Под ред. Д. С. Лихачева. М„ 1987.
Швед В. В. Гарадзенскае княства і яго ўладальнікі//Швед В. В.
Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны. -Гродна, 1995. С. 6-11.


**ГРОДЗЕНСКАЯ ШКОЛА ДОЙЛІДСТВА**


Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993.
Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыкланедыя. МII., 1993.
Слючанка В. Р. Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне. Мн., 1992.
Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1993.


**ГУДЗЯЦЬ ГАРАДЗЕНСКІЯ ТРУБЫ"**


Длугош Ян. Грюнвальдская битва. — М., Л., 1962.

Краўцэвіч А. К. Тэўгойскі ордэн: Ад Ерусаліма да Грунвальда. Мн., 1993.
Патаненак Г. Радавод Давыда Гарадзепскага//Гродзенская праўда — 1992 — 14 лістапада — С. 4.
Ткачев М. А. Замки Белоруссии. — Мн., 1987.
Ткачев М., Бурдук Н., Каташков А. Князь Давыд-воевода Городенский//Гродненская правда ~ 1987 — 3 января ~ С. 3.
Цыхун А. Давыд Гарадзенскі//Гродзенская праўда — 1992 — 1 жніўня — С. 4.

**ПАД УЛАДАЮ ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ**

Ермаловіч М. Старажыгная Беларусь. Полацкі і Навагародскі перыяды. ~ Ми., 1990.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. Ми 1994.
Краўцэвіч А. К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIVXVIII стст. Мн., 1991.
Насевіч В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага. МII., 1993.

**ВІЗІТНАЯ КАРТКА ГОРАДА**

Гостев А. Символы//Гродненская правда 1988 8 октября.
Милинкевич А. А. Наш древний герб// Высота 1990 24 августа.
Мілінкевіч А. А. Вяртанне праўды//Гродзенская праўда ~ 1990 25 кастрычніка.
Швед В. В. По следам Гродненской старины. — Гродно, 1993.

**НА ПРАВАХ МАГДЭБУРГА**

Цітоў А. К. Гарадская геральдыка Беларусь — Мн., 1989.
Цітоў А. К. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі. ~ Мн., 1993.

**"ПРАЎДЗІВАЕ АДЛЮСТРАВАНІЕ ГОРАДА..."**

Борисовская Н. Старинные гравированные карты и планы XVXVIII веков. М., 1992.
Гостев А. П. "Истинное изображение города Гродно"//Гроднепская правда — 1977 — 17 сентября — С. 3.
Киркевич А. Гродна 400 год назад//Беларусь — 1965 — № 11 — С. 30.
Кішык Ю. М. Гродна сярэднявяковы//Помнікі гісторыі і культуры Беларусі 1974 № 4 С. 23-28.
Сабалеўская В. Вяртанне з иябыту. Сілуэгы Гродна XVI ст.// Гродзенская праўда 1993 27 мая С. 3.

ЗМЕСТ

"Намалюем горад наш" (Слова да чытача)
Нараджэнне горада (А. А. Дабрыян)
Імя горада (А. П. Госцеў)
Гарадзенскае княства (А. П. Госцеў)
Гродзенская школа дойлідства (А. А. Дабрыян)
"Гудзяць Гарадзенскія трубы" (В. В. Швед)
Пад уладаю вялікіх князёў літоўскіх (А. А. Дабрыян)
На правах Магдэбурга (А. П. Госцеў)
Візітная картка горада (В. В. Швед)
"Праўдзівае адлюстраванне горада..." (В. В. Швед)
Што можна пачытаць

www.kamunikat.org

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год